– Работаю на даче в Ждановичах. Являюсь генеральным секретарем Белорусской социал-демократической партии («Грамада»). Живу один – уже десятый год, как супруга умерла. Дети живут отдельно (сын – врач, дочь – юрист). Каждый день занимаюсь физкультурой: если нахожусь в Минске, утром полтора часа отвожу на ходьбу, иду от своего дома на улице Пулихова к Оперному театру, подтягиваюсь, отжимаюсь от дерева. Если на даче – утречком иду на водохранилище, делаю зарядку, купаюсь. В общем, не скучаю.

– Сколько раз подтягиваетесь в свои 76 лет?

– Шесть раз.

– Привилегии какие-то имеете как бывший председатель Верховного Совета?

– Никаких. Пенсия у меня обычная. Все депутаты Верховного Совета 12-го созыва – не в почете. То есть все, кто не пошел сотрудничать с сегодняшней властью. Хотя они принимали Декларацию о независимости, Конституцию, кстати, среди них был сам Александр Лукашенко.

Финансовая поддержка (не суть, как она называется – пенсия или еще что) начинается с депутатов первой Палаты представителей. Депутаты Верховного Совета 12-го и 13-го созывов остались за бортом.

– Какую зарплату вы получали как председатель Верховного Совета?

– Где-то три с половиной миллиона. Наверное, это было в два – два с половиной раза выше средней зарплаты по стране. Когда работал в Витебске начальником управления внутренних дел облисполкома, у меня была хорошая квартира. После избрания депутатом Верховного Совета сдал ее горисполкому, а мне за это дали в Минске четырехкомнатную. Когда стал председателем парламента, за мной закрепили машину и двух водителей (работы было много, мог пользоваться автомобилем круглые сутки), несколько сотрудников КГБ в охрану, дали два дипломатических паспорта (нужно было много ездить за границу) и выделили резиденцию в Дроздах, которая досталась в наследство от первого секретаря ЦК КПБ.

– Это та резиденция, в которой сейчас Лукашенко живет?

– Да. Мы семьей (жена, дети) занимали ее, пока его не избрали президентом. Место хорошее, рядом лес, водоем, баня, небольшой бассейн, все благоустроено. Говорят, там сейчас много что перестроили.

Я от резиденции не отказывался, потому что исходил из принципа, что меня избрали главой государства (я же был не спикером, а председателем Верховного Совета), поэтому должен был представлять республику при визите гостей соответствующим образом.

Шушкевич от резиденции тоже как будто не отказывался, но жил в своей квартире, а резиденцию использовал только для приема гостей.

– Журналисты рассказывают, что при Шушкевиче все было настолько демократично, что во время обеда можно было подсесть за столик к председателю Верховного Совета и поговорить с ним.

– Дело в том, что мы питались в столовой Совета министров. Кто заходил в здание Дома правительства, тот мог спокойно идти в столовую. Никаких ограничений не было.

«Люди были заряжены на протестное голосование»

– Какой была самая необычная просьба к вам, как к председателю Верховного Совета?

– Самая необычная просьба поступила от Лукашенко, когда он уже стал президентом. Как-то разговаривали с ним, он сказал, что не нужно писать на него представления в Конституционный суд. Я ответил: но ведь нельзя допускать нарушения закона, извините, я ж по-другому не могу. Он: а вы закройте один глаз.

– Сергей Наумчик в книге «Дзевяноста чацвёрты» описал такой эпизод. После первого тура президентских выборов-1994 в БНФ родилась идея: Кебич снимает свою кандидатуру, Лукашенко остается на второй тур один, интерес у избирателей к выборам падает, явка оказывается низкой и, возможно, второй тур признается несостоявшимся. И тогда назначаются повторные выборы с повторным выдвижением кандидатов. Для обсуждения этого вопроса к вам в санаторий «Радон», где вы отдыхали, приезжал Пазьняк. О чем вы говорили во время прогулки в лесу?





Мечислав Гриб торжественно подписывает первую Конституцию Республики Беларусь.

– Да, обсуждали такой вариант: если второй тур не состоится, то по Конституции президентом до новых выборов автоматически становится председатель Верховного Совета (как это недавно в Украине было). Но, честно говоря, я не верил в такой вариант развития событий. Лукашенко тогда много людей поддерживало – нравятся им популисты. Если бы Кебич даже снялся, то люди все равно пошли бы голосовать за Лукашенко, они были заряжены на протестное голосование.

Первые президентские выборы могли не состояться при другом варианте. Вы помните, наверное, инцидент с обстрелом машины кандидата в президенты Лукашенко под Лиозно. Я как узнал об этом, поговорил с Димой Булаховым, который состоял в его команде. Тот мне сказал: вы не волнуйтесь, это покушение добавит нам 15–20% голосов.

Потом экспертиза дала заключение, что выстрелы в автомобиль не могли быть произведены с проезжавшей рядом машины. Я думаю, сегодня ни у кого нет сомнений в характере того «покушения»: 21 год прошел, а ответственных за тот инцидент не нашли. А ведь Лукашенко никому ничего не прощает. А тут речь о целом покушении на его жизнь!

Так вот, если бы в тот момент другие кандидаты в президенты обратились в Верховный Совет или Центризбирком с заявлениями о том, что информация о покушении на Лукашенко ставит участников президентской гонки в неравные условия, то летом 1994-го его могли бы и не избрать.

– Был у вас разговор с Лукашенко после его избрания?

– На второй день он собрал основных фигур в государстве на «обед победителей». Накрыли стол, выпили по рюмке, поговорили. Но настроение у меня было упадническое. И я видел, что не было настроения и у Кебича, чтобы он сейчас ни писал и ни говорил.

– Вы уже предполагали что-то нехорошее?

– Конечно. Лукашенко не был для нас секретом. Мы же с ним пять лет варились в одной каше в Верховном Совете. И не только я, большинство депутатов к нему относились настороженно. Ведь когда он захотел баллотироваться в президенты, было два варианта: собрать не менее 100 тысяч подписей избирателей или не менее 70 подписей депутатов. Представители Лукашенко смогли собрать в Верховном Совете, по-моему, не более 30 подписей.

...Потом, после избрания, Лукашенко как-то заехал ко мне, чтобы пообщаться один на один. Требование ко мне у него было одно: дать ему право издавать документы, равносильные закону. Я ответил: вот Конституция, там записано, что единственным и высшим законодательным органом является Верховный Совет, чтобы придать вашим указам статус законов, надо вносить изменения в Конституцию. Отсюда у Лукашенко и пошла обида на меня и на Верховный Совет. Он считал, что если сможет оперативно издавать законы, то это поможет поднять экономику. Но «оперативно» и «закон» – понятия несовместимые. Закон должен быть выверен, обсужден, переработан. Один человек, каким бы он ни был, может допустить ошибку.

Когда Лукашенко стал издавать указы, противоречащие Конституции, я начал писать на него представления в Конституционный суд – наверное, 16 представлений подал. Суд выносил решения о приостановлении указов, но Лукашенко со временем просто перестал выполнять эти постановления.

Меня еще вот какой момент удивляет. На референдуме 1996 года обсуждались вопросы о внесении изменений и дополнений в Конституцию. При голосовании на каждом бюллетене было написано: вопросы носят совещательный характер. Изменения и дополнения в Конституцию мог вносить единственный законодательный орган в стране – Верховный Совет. Но он этого не сделал. Я как юрист могу сказать: новая редакция Конституции, по которой мы сегодня живем, нелегитимна и незаконна.

– Лукашенко-президент и Лукашенко-депутат отличались?

– Отличались в том смысле, что когда он был депутатом и выступал, то его могли слушать, могли не слушать, могли послать. Была демократия. А когда он стал президентом и, мягко говоря, автократом, никто с ним спорить не решался. Ну сказал, что Скорина жил в Питере, – ну и что, кто возразит ему? И потом – всякая власть портит людей. Редкий человек выдерживает испытание ею.

«Лукашенко много пакостей мне сделал»

– Лукашенко в 1995-м сказал: Гриб переметнулся от коммунистов к национал-радикалам.

– Ну какой из меня национал-радикал? Я социал-демократ. Он сказал так, потому что уже шел на меня войной. Кебич и Лукашенко – большие любители строить страну и жить за счет чужих дядей. У меня совсем другой подход. И тогда я был уверен, и сейчас, что мы в состоянии все вопросы решать самостоятельно.

Когда меня избрали председателем Верховного Совета, то я решил, что буду проводить заседания на *беларускай мове*. Так и сделал. Для многих это было охренительно неожиданно: советский генерал заговорил на мове! Но ничего, может, где-то я допускал ошибки (все же заканчивал русскую школу), но люди меня не критиковали и не смеялись надо мной. Наверное, видели искренность, с которой я старалось.

Лукашенко много пакостей мне сделал. В конце 1995-го на выборах доизбрали наконец депутатов Верховного Совета нового созыва. По закону отпускался один месяц, во время которого должен был еще работать предыдущий созыв. Но вот вчера только состоялись выборы, а уже назавтра утром ко мне домой не приехала машина. Шофер позвонил: меня не выпускают из гаража. Пришлось добираться до работы самостоятельно. Но жаловаться не стал: неудобно перед людьми.

– От президента доставалось не только вам, но и другим депутатам.

– В Верховном Совете 12-го созыва из около 350 депутатов на постоянной основе работали только 80, остальные совмещали законотворчество с основной работой. Они приезжали в Минск на время сессии, им снимали гостиницу. Питание им не оплачивали, поэтому каждый привозил с собой продукты – сало, колбасу. Утром перекусывали в буфете, обедали в столовой Совмина, а вечером ужинали в своих номерах. Понятно, что приглашали друг друга. Ну а если три мужика собрались, то что ты сделаешь – надо и по 100 граммов выпить. А Лукашенко стал выдавать это за разврат. Хотя он раньше сам точно так же жил! Да, были выпивки, но никто не хулиганил, не ломал мебель, не валялся пьяным. Я из жизненного опыта людей понимал. Да и что я мог им сказать? Что вы вчера за ужином выпили с Иваном Ивановичем и Сергеем Петровичем по 100 граммов? Так мне ответили бы: ну выпили, а тебе какое дело?

– Как думаете, у вас была возможность не допустить той ситуации в стране, которую мы сегодня имеем?

– Когда мы принимали Конституцию, то были неопытными руководителями. Нам казалось, что мы уже достигли демократии, поэтому кинулись к этому президентству как к уже испытанной в цивилизованных странах практике. А надо было хотя бы один-два срока избрание президента поручить Верховному Совету и посмотреть, что из этого получится. Конечно, депутаты Лукашенко президентом не избрали бы, авторитета в Верховном Совете у него никакого не было.

– Когда стали председателем Верховного Совета, неужели на примере Шушкевича не видели, что нужно увереннее брать власть в свои руки, собирать вокруг себя команду?

– У меня таких мыслей не было. Понимаете, я не большой любитель власти, она для меня обременительна. Когда сняли Шушкевича и мне на заседании президиума предложили выдвинуть кандидатуру, я категорически отказался. Но мне дали возможность подумать. Я пришел домой, начал советоваться с женой и сестрой, а они в один голос: да зачем тебе это надо, посмотри как Шушкевича каждый день критиковали и били. Но депутаты меня все же уговорили. Кажется, на третий день раздумий я дал согласие выдвинуть свою кандидатуру.

– Что считаете своим главным достижением на посту главы парламента?

– То, что нам удалось принять первую – демократическую – Конституцию Республики Беларусь.

«Из-за ситуации в Украине со многими знакомыми рассорился»

– Мечислав Иванович, что вас сегодня радует?

– Дети, внуки, семья. Когда со здоровьем все хорошо, тоже радует.

– Что огорчает?

– Социально-экономическая ситуация в стране, безысходность, постоянное вранье и обман с телеэкранов. Очень огорчает война на юго-востоке Украины, я считаю, что это интервенция со стороны России. Со многими своими знакомыми из-за этого рассорился. Но меня никто не переубедил, что это не так. Никогда не мог подумать, что доживу до того, что Россия будет воевать с Украиной.

– Какими видите перспективы нашей страны?

– Я считаю, что мы должны быть в европейской семье, в Европейском Союзе. Конечно, это очень длительный процесс. Мы пока не готовы к вступлению в ЕС, и, что самое обидное, мы к этому не готовимся. Считаем, что избрали самый верный путь, а на остальное нам чихать. Идем, а куда идем? Мой хороший друг поэт Владимир Ермолаев (к сожалению, он умер в прошлом году) написал такие строки:

Кіпіць жыццё у барацьбе.
Віват, пературбацыя!
Вяла наперад КПБ,
цяпер – Адміністрацыя.
Ваду зноў у ступе таўкуць,
ды людзі з тымі ж бедамі.
Куды на гэты раз вядуць,
Пакуль ніхто не ведае.

А хочется, чтобы в стране появилась законность, демократия, чтобы людям дали жить и развиваться. Чтобы каждый занимался тем делом, которым хочет, чтобы не душили предпринимателей. Белорусы очень способные и толковые люди, зря их ругают как народ. Нормальные, грамотные, способные люди. Не убивайте их инициативу, дайте свободу – они вам из воздуха деньги сделают. Никакой нефти нам не надо будет, все сами сделаем.

Руслан ГОРБАЧЕВ.

ЧУЛІ?

Будзем ездзіць на кадылаках...

Кампанія General Motors і беларускае прадпрыемства «Юнісон» заключылі пагадненне аб буйнавузлавой зборцы ў нашай краіне Cadillac Escalade і Chevrolet Tahoe.

Пра гэта паведаміла агенцтва «Інтэрфакс-Захад» са спасылкай на прэс-службу кампаніі GM.

«На заводзе "Юнісон" усталявана сучасная вытворчая лінія для зборкі мадэляў Cadillac і Chevrolet, а персанал падрыхтаваны і навучаны ў адпаведнасці з прынцыпамі арганізацыі вытворчасці і кантролю якасці, прынятымі на ўсіх заводах GM», – падкрэслілі прадстаўнікі прэс-службы. Прадукцыя, выпушчаная пад Мінскам, у асноўным будзе пастаўляцца на расійскі рынак. Справа ў тым, што ў Беларусі будуць збірацца аўтамабілі чацвёртага пакалення Cadillac Escalade ў дзвюх мадыфікацыях: у рэгулярнай версіі і з павялічанай колавай базай. За рэгулярную версію давядзецца заплаціць 76 тысяч долараў, машына з павялічанай колавай базай абыдзецца прыкладна ў 80 тысяч долараў. Пераважнай большасці беларусаў такія аўто не па кішэні.

СУД

Пад прымусам

Да пазбаўлення волі на два з паловай гады асуджаны былы дырэктар філіяла УП «Мінаблгаз».

Як паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Мінскай вобласці ўстанавілі, што на працягу шасці гадоў дырэктар «Вілейкарайгаза» Анатоль Маркевіч выкарыстоўваў сваё службовае становішча з асабістымі мэтамі.

З 2006-га па 2012 год ён прыцягваў падначаленых для работы за межамі газавай гаспадаркі. У працоўны час яны займаліся ўборкай бульбы, зборам грыбоў, рамонтам кватэр і катэджаў. Наймальнік жа выплачваў ім толькі афіцыйную заработную плату, фактычна ператварыўшы людзей у рабоў на будпляцоўках.

У кола «замоўцаў» бясплатнай працы ўваходзілі не толькі зламыснік, яго радня, але і шматлікія знаёмыя: раённыя чыноўнікі і кіраўнікі прадпрыемстваў.

Не засталіся па-за ўвагай праваахоўных органаў і факты нямэтавага выкарыстання службовай тэхнікі, аўтатранспарту. Істотнае павелічэнне нагрузкі і працоўных затрат іншых работнікаў, якія выконвалі вытворчыя задачы падчас адсутнасці калег, таксама былі ўлічаны пры прызначэнні пакарання.

Усяго на судовым пасяджэнні было апытана больш за 30 рабочых, якія выконвалі незаконныя распараджэнні свайго кіраўніка і пацвердзілі доказы абвінавачання.

«У выніку злачыннай дзейнасці дырэктар «Вілейкарайгаза» нанёс урон асабістым інтарэсам і правам работнікаў прадпрыемства, а таксама матэрыяльны ўрон у буйным памеры, – рэзюмаваў начальнік ГУБАЗіК МУС па Мінскай вобласці Віктар Шапавал. – *Каб даказаць віну фігуранта справы, аператыўнікі некалькі месяцаў праводзілі спецмерапрыемствы па пошуку доказаў і ўстанаўленні сведак».*

За злачынства, прадугледжанае ч.2 арт.424 КК (злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі) суд прызначыў абвінавачанаму пакаранне ў выглядзе двух з паловай гадоў пазбаўлення волі і штрафу ў памеры 300 базавых велічынь. Акрамя таго, ён будзе пазбаўлены на тры гады права займацца дзейнасцю, звязанай з арганізацыйна-распарадчымі функцыямі і матэрыяльнай адказнасцю.

Паводле слоў Віктара Шапавала, многія кіраўнікі і чыноўнікі ў райцэнтрах лічаць нормай перыядычна карыстацца сваім службовым становішчам з асабістымі мэтамі. Яны не баяцца, напрыклад, адправіць падначаленых да сябе на дачу ў працоўны час, каб выкапаць траншэю ці пакласці плітку, выкарыстоўваць службовае аўто ці тэхніку для ўласных патрэб.

«Службовым асобам трэба памятаць, што менавіта яны, маючы значна больш спакусаў і магчымасцяў «свайго крэсла», знаходзяцца пад пільным кантролем праваахоўных органаў», – нагадаў Віктар Шапавал.

Нам 20 год

ВІНШАВАННІ

З цемры – да святла

Паважаныя народавольцы! Ведаю, што сёння кожны сумленны чалавек, патрыёт Беларусі віншуе Вас і ўсіх нас, чытачоў, з 20-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара "Народнай Волі". Я таксама далучаюся да агульнага голасу.

Мы помнім тыя часы, калі "Народную Волю" атрымлівалі па пошце ў канвертах. Улада нас бессаромна душыла, але Вы і мы, падпісчыкі, вытрымалі здзекі і перамаглі. Хоць тыраж газеты сёння, на жаль, адносна невялікі, але мы адчуваем сябе адной сям'ёй. Вы рэдкі прыклад для нас, мы ж узбагачаемся праўдай ва ўсіх варунках нашага жыцця. Вы, журналісты незалежнага выдання, узнімаеце нас з цемры да святла, узмацняеце наш дух.

Нізкі паклон Вам, шаноўныя народавольцы!

Жыве Беларусь! Жыве наша родная "Народная Воля"!

З павагай –

Мікола КАНАХОВІЧ, афіцэр у адстаўцы.

г.Пружаны Брэсцкай вобласці.

Віншую калектыў "Народнай Волі"
З 20-годдзем у галоўнай ролі
І ад імя удзячных чытачоў
Жадаю поспеху ўсім ў гэтай ролі!

Сяргей ПРЫЁМКА.

ПАВАЖАНЫ ІОСІФ ПАЎЛАВІЧ !

Прыміце шчырыя віншаванні з нагоды ***20-годдзя выдання Вашай газеты!***

Жадаю Вам і ўсім супрацоўнікам Вашага калектыву моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, плёну дзеля радасці ў творчасці, а таксама таленавітых матэрыялаў,

такіх, якія не так даўно
пісаў мой бацька!
З павагай –

Вадзім БУТКЕВІЧ .

У няволі з "Народнай Воляй"

Да 20-годдзя сапраўды ўсенароднай газеты.

Прагу волі змаганнем спатолім,
Хоць і час – як знявечаны смоўж...
У няволі з "Народнаю Воляй"
Памнажаецца крыл нашых моц.

Набіраецца дух вольны сілы...
Хутка трэба яму ўжо на ўзлёт!
Для каго, пакажыце, нямілы
Вольны, дбайны і мужны народ?

Ёсць жа вылюдкі зла, што смакуюць
Звады, плёткі, у кайф ім грашыць...
А "Народную Волю" шануе,
Ў кога добрая воля ў душы.

Мікола ТРАФІМЧУК.

Здароўя і поспехаў!

Шаноўны Іосіф Паўлавіч, віншую Вас, рэдакцыю і ўвесь каллектыў «Народнай Волі» з юбілеем!

Вы заўжды, нават у самых няпростых умовах, неслі людзям слова праўды, альтэрнатыўную думку і погляды, любоў да Радзімы і беларушчыны. Моцнага ўсім Вам здароўя і творчых поспехаў!

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ.

Так держать!

Поздравляю с прекрасным завоеванным юбилеем!

Не думаю, что хоть одна газета в Беларуси пользуется такой популярностью. В киосках нашего города обычно «Народную Волю» прячут под другие издания, но это не помогает – читатели все равно находят свою газету.

Есть в Беларуси достойные ЛЮДИ! Вы выдержали натиск! Спасибо!

В боксе есть выражение «уметь держать удар». Вы сумели! Жыве Беларусь!

Ю.А.СИЛЬВАНОВИЧ.

г.Лида.

ЖИТЕЙСКАЯ ТЕМА

Воды!!!



Дачный сезон в разгаре. Надо ли объяснять, как нужна вода? Тысячи и тысячи дачников спешат на свои дачные участки, чтобы отдохнуть, пообщаться с природой и, конечно же, потрудиться на своих грядках, вырастить какой-то урожай, так необходимый в наше нелегкое время.

Одна из важнейших проблем дачных товариществ – обеспечение водой. О ее решении мечтает практически каждый владелец дачного надела.

Что ж мы имеем на самом деле? При постоянном расширении дачных хозяйств, строительстве новых объектов хозяйствования технических возможностей водоснабжения не хватает. Бурение личных скважин большинству дачников не по карману.

Решить эту проблему можно только увеличением мощности или сооружением новых водообеспечивающих систем.

В нынешнее время многие дачные товарищества хиреют, участки заброшены, совершенно бесперспективны. Причина все та же – нет воды.

Господа депутаты, это ведь ваши вопросы! Неужели в нашей Синеокой, богатой пресноводными ресурсами, тысячами рек и озер, нельзя решить эту проблему?

Здесь просматривается не только экономическая сторона, здесь и здоровье, и полезное занятие для многих пенсионеров.

Видится еще одна проблема: широко рекламируются средства для сооружения мобильных портативных душевых, так необходимых каждому дачнику. Спрос на них был бы значительно выше, если бы было нормальное водоснабжение.

Повторимся, это и здоровье, и нормальный быт, и культура, которой нам так не хватает. Престиж дачных товариществ был бы значительно выше.

Господа депутаты, помогите найти решение поднятой нами проблемы!

Александр ВАРАКСА,
Ольга ВАРАКСА.

Минск.

ШЧЫРА

Не гніся пад ветрам, душа...



Не раз бачу на лавачцы ля дома гэтага чалавека. Немалады ўжо, хаця яўна і не дацягвае да майго веку (а мне 79 стукнула), увесь нейкі азызлы, са згаслымі вачыма. І на ладным, відаць, падпітку: твар аж барвовы, пад лавай напалову пустая пляшка, да якой ён прыкладваецца паміж зацяжкамі цыгарэты. Заўважыў: да аматара "культурна адпачыць" часцяком далучаецца хлапечая кампанія, і тады пах алкаголю ўперамешку з махровымі матамі-пераматамі запаланяе пляцоўку перад шматпавярховым домам, лезе проста ў вокны. Усім гэтым "любуюцца" і ўсё гэта чуюць жыльцы, іх дзеці-ўнукі...

Нарэшце, не вытрымліваю, падыходжу да знаёмага незнаёмца, рызыкуючы нарвацца на "цёплы" прыём. Але ён маўчыць, бы не заўважае мяне, не адрываючыся ад улюбёнага занятку. Спытаўся дазволу, прысаджваюся побач. Прыкідваю: з чаго пачаць размову, каб пайшла ў мірным рэчышчы. Цікаўлюся, як жыццё-быццё і што за бяда прымушае небараку вось так "прыгожа" бавіць час.

Ён доўга маўчыць, потым мала-памалу ўцягваецца ў размову – відаць, набалела, а падзяліцца няма з кім.

– Жыццё, пытаеш? Што гэта за жыццё пад старасць? Пенсія – сам ведаеш, лекі патрэбныя і тыя не купіш... Жонка калі была – талковая, эканомная, дык неяк лепш разам круціліся. Пахаваў яе – адзін бядую. Ёсць сыны, ды зусім на бацьку забыліся...

– Вакол цябе, заўважаю, процьма маладзёжы таўчэцца, і ўсе – з пляшкай...

– Я ж кажу: жыццё такое. Думаеш, ім соладка? Хто на працу ніяк не ўладкуецца, у каго ў сям'і нелады.

– Падумай, няўжо ад такой "весялосці" вашы кашалькі патаўсцеюць, здароўя прыбавіцца, а зайздросныя рабочыя месцы абдымкі перад усімі раскрыюць? Можа, у стасунках з сямейнікамі ўсё ўпарадкуецца найлепшым чынам?

– Ат, не разумееш ты такіх, як я! – махнуў рукой субяседнік. – Ідзі сабе ўжо далей, куды ішоў...

Мне, прызнаюся, стала крыўдна. Як гэта – не разумею? Я што, з Марса зваліўся? У самога тыя ж – ці падобныя – "параметры" лёсу . У дзяцінстве разам з мамай і сястрычкай, як і ўсе з нашага пакалення, перажылі жахі вайны на акупаванай тэрыторыі. Бацька загінуў на фронце, і нават у першыя мірныя гады сям'я сербанула гора пад завязку. Мама ў полі, я з ёю – каб хоць крыху падсабіць, зарабіць якую капейчыну ў саўгасе. Падлеткам захапіўся сельгастэхнікай, вырашыў, як вырасту, звязаць сваё жыццё з працай на зямлі, старацца, каб добра радзіла. Пасля дзесяцігодкі скончыў Мар'інагорскі сельгастэхнікум, затым – профільны інстытут у Ленінградзе і паехаў па накіраванні на Палессе, у Іванаўскі раён.

Праца агранома (пэўна, як і ўсялякая іншая, калі ты любіш яе, а не зямлю цяжыш) патрабуе і сучасных ведаў, і сыноўскіх пачуццяў да зямлі-карміцелькі, клопату пра яе здароўе ў любую непагадзь – і пад снегам, і пад ліўнем, і пад градам. Не было калі наракаць на такую наканаванасць, сам жа выбраў дарогу і не збочыў з яе. Хлебаробская справа – ганаровая і нічым не заменная, і я, не хвалячыся, аддаваў ёй усе сілы. Маю за сваё стараннe ўзнагароды той пары – ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, граматы Вярхоўнага Савета БССР. І хоць той час даўно мінуў, узнагароды тыя не выкідваю: людзі казалі, што заслужыў.

Цяпер, калі ўжо даўно на пенсіі, жыву ў Мінску. Не ўтойваю, сапраўды цяжка адному. Некалькі год таму адышла ў іншы свет мая дарагая жоначка Нела Герасімаўна. Мы пражылі душа ў душу шмат гадоў, былі адно аднаму апорай і суцяшэннем у любых варунках. Яна, выдатны урач-рэнтгенолаг, мела кандыдацкую ступень у медыцынскай навуцы, ратавала – і многіх уратавала – ад цяжкіх хвароб, а то і смерці. А вось сябе не здолела ўратаваць...

Перажыць незваротную страту і скруху мне дапамагаюць сябры. Нашы агульныя з Нелай сябры, што не пакінулі, не адхінуліся, калі яе не стала. Не нейкія там забулдыгі-сабутэльнікі, якім насамрэч на цябе напляваць, а верныя, надзейныя, блізкія людзі: Іна Апалонава, Галіна Шыкунова, Анатоль Пятроўскі, Аляксандр Грабоўскі, Леў Арцюх... У нас і разуменне жыцця, і інтарэсы-захапленні ў многім супадаюць. Разам наведваем месца апошняга спачыну Нелы, згадваем перажытае. Па-ранейшаму бавім сваім гуртом вольны час, адзначаем дні народзінаў. Не забываюся на сяброўскія святы прыхапіць з сабою гармонік – дарунак тульскіх сваякоў. Спяваем улюбёныя з маладосці і сучасныя песні, згадваем, як прыгожа гучаў у нашым хоры яркі Нелін голас. А то просяць, каб я пачытаў свае вершы – даўно іх складаю, прысвячаю сябрам, розным жыццёвым ураджанням. Тут і лірыка, і гумар, і іронія – пад настрой. Аднойчы апісаў, як мы зладзілі культпаход у "Чижовка-Арену". Глядзелі гандбольны матч, за беларускую каманду балелі, аглядалі ўнікальнае спартыўнае збудаванне.

Цікавасць да спорту ў мяне не толькі глядацкая. Мой стары веласіпед рэдка адпачывае, неразлучны я з ім яшчэ з аграномскай маладосці. Ад Мінска да, скажам, Мар'інай Горкі і назад наўпрост шыбую, нашмат скарачаючы дарогу. А ўжо на рыбалку, на прыроду, ды яшчэ з фотаапаратам... Любата! А яшчэ доўгія гады займаўся маржаваннем, купаюся амаль штодня ад лёду да лёду. Пашанцавала, што Цнянскае вадасховішча блізка ад дому.

Ёсць яшчэ захапленне – кнігі, чытаю запоем. Як, дарэчы, і сваю любімую "Народную Волю", якую ад душы віншую з 20-годдзем з дня народзінаў і якой глыбока ўдзячны за яе мужную праўду і вернае служэнне Беларусі.

...Канечне, узрост і хваробы нагадваюць пра сябе. Перанёс некалькі сур'ёзных аперацый, спіна ўжо не такая прамая. Але не жалюся і не плачуся. Галоўнае, каб душа не сагнулася пад ветрам, інакш паважаць сябе не буду. Бо сакраментальнае "Ты м-мяне п-паважаеш?" у п'янай кампаніі – зусім не тое, што падтрымае тваю годнасць, суцішыць боль.

Шкада мне, вельмі шкада майго субяседніка на лавачцы. Разумею: чалавек страціў душэўную апору і папросту губіць сябе. Асабліва балюча, што такіх, каму нестае ўдумнасці і сілы волі нешта змяніць у сабе самім, не так ужо і мала. А можа, яшчэ не ўсё згублена? Дай Бог...

Леанід Іванавіч
АРЦЮШЭЎСКІ, 79 год.

Мінск.

Ад рэдакцыі

Допіс нашага чытача Леаніда Арцюшэўскага ўжо быў падрыхтаваны да друку, як стала вядома: бязлітасная спёка прывяла шаноўнага аўтара ў бальнічную палату. Зычым яму хутчэйшай папраўкі і спадзяёмся: ён набярэцца новых сіл і яшчэ возьме ў рукі свой гармонік!

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Как «проспали» Украину и крокодильи слезы Путина

Сейчас много говорят и пишут об Украине. Хочу и я высказать свои мысли на сей счет.

В том, что случилось у наших соседей, считаю, виноваты прежде всего бывшие президенты Украины: Кравчук, Кучма, Ющенко. Особенно Кучма, который возглавлял страну два срока. После распада СССР нужно было понимать, что придет время – и Россия, грубо говоря, очухается, будет претендовать на Крым. Нужно было заселять его украинцами из западных областей: строить им жилье, предоставлять льготные кредиты, дать деньги на переезд... И если бы в Крым переехало тысяч 800–900 украинцев, не было бы псевдореферендума. Ведь надо было понимать: Россия – имперское государство, и она будет всегда претендовать на захваченные ею когда-то территории.

Конечно, и Европа с Соединенными Штатами Америки виноваты в том, что Крым захвачен Россией, война идет в Донецкой и Луганской областях. Думаю, и Евросоюз виноват в бандитских действиях России. В 1992 году Российская Федерация поддержала сепаратистов в Приднестровье. Сошло с рук. К началу 2008 года в Абхазии и в части Осетии до 80 процентов населения имело российские паспорта. Когда случился захват Россией этих территорий в 2008 году, Европа и США фактически промолчали, хотя еще тогда нужно было вводить санкции и ограничения против Москвы.

Наплевать Путину на Будапештский меморандум и другие международные соглашения. Он открыто заявляет, что распад СССР – это большая трагедия. Ему, видите ли, подавай империю!

В России существует закон, предписывающий, что граждане не имеют права участвовать в вооруженных (несанкционированных) конфликтах в других странах. За самовольные действия предусмотрена уголовная ответственность. Господин Путин, господин генеральный прокурор России, скажите: сколько добровольцев, воюющих в Донецке, Луганске, привлечены к суду?

Да, Россия не отправляла своих солдат в Донецк, Луганск под звуки фанфар. А как же смерть бурятских танкистов? Мне противно слушать ваши высказывания о том, что вам жалко братский украинский народ. Все это ложь, вы льете крокодильи слезы, господин президент. Какой вы православный христианин? Вспомните, что Господь сказал: возлюби ближнего своего, любите врагов своих! А вы посылаете в Донбасс «Грады», танки, российских граждан на смерть посылаете, ну и, конечно, украинцев убиваете. Затем шлете гуманитарную помощь. Не послали бы Бородая, Гиркина со товарищи – и все было б хорошо. Не нужна была бы никакая гуманитарная помощь.

Посмотрите передачи российских телеканалов: если пригласят одного-двух человек, защищающих позицию Украины, то им слова сказать не дают. Устраивают такой базар-скандал, что этих людей (украинцев) совсем не слышно, или же после нескольких слов их перебивают (лишают слова) ведущие программы. Что это за заявление: «Если Россия захочет, то будем через два дня в Киеве, нет такой нации, как украинцы, а есть только русские».

В одном я уверен: Путину нужно иметь сухопутный путь в Крым, для этого и затеяно все это с захватом 6–8 областей Украины.

Я сочувствую родственникам погибших 2 мая в Одессе. Но, уверен, там был задуман донецкий вариант, но его остановили.

Путин не имеет ни юридического, ни морального права осуждать киевские власти, которые борются за сохранение целостности своей страны. Почему, скажите, при Путине давили и убивали чеченцев, которые хотели выйти из состава России? Для Путина они были бандитами, убийцами. Так почему В.В.Путин не считает сегодня бандитами и убийцами восставших против законной власти в Донбассе?

Пользуясь случаем, хочу высказать несколько слов о статье Павла Знавца, напечатанной в «Народной Воле» 22 мая. Я не согласен с тем, как автор рассматривает решение Кремля по белорусскому вопросу. Хотя я и не поклонник А.Г.Лукашенко, но в чем-то согласен с ним. Россия и в самом деле понимает, что военной силой захватить Беларусь невозможно. У нас армия не та, что была в Украине. У нас примерно 60 тысяч военнослужащих, да где-то сто тысяч милиции с внутренними войсками. И, как сказал Лукашенко, мы сразу же погасим загорающийся огонь. Это значит, что те, кто попытается военным путем втянуть нас в состав России, будут уничтожены. Мне 69 лет, но я в случае необходимости пойду защищать свою Родину с оружием в руках, и, думаю, таких немало.

Вы, Павел, должны понимать, что нападающих гибнет в 2–3 раза больше, чем защищающихся. Поэтому не думаю, что матери России позволят Путину привезти в страну 200–250 тысяч гробов.

Россия пойдет (и уже идет) по другому пути. Дешевый газ, нефть, кредиты, выкуп наших предприятий... Вот ее путь захвата Республики Беларусь.

На территории России можно расселить 1,5–2 миллиарда человек без проблем. Так приглашайте, помогайте русским переезжать на просторы исторической родины. А Путин говорит: наши интересы там, где «русский мир». Но русские живут более чем в половине стран мира. Так что, со всеми воевать? Пусть попробует Путин захватить Англию, ведь там живут более 300 тысяч русских! За Великобританию можно и по зубам получить. Страны Балтии маленькие, Молдова, часть Казахстана – это лакомые куски для России независимо от того, кто будет ее президентом.

Мне не понятна позиция сегодняшних руководителей Финляндии, Чехии, Венгрии, которые будто забыли стук российских сапог, лязг русских танков на своих территориях. Запомните: имперские государства очень любят возвращаться к таким картинкам. Финны, чехи, венгры, вы хотите быть в Российской империи?

Только жесткая позиция США и Евросоюза заставит ястребов из России оставить в покое Украину и другие страны. Один ведущий на кремлевском телевидении договорился до того, что заявил: «Россия может превратить Америку в ядерную пыль». Но этот, простите, придурок не понимает, что если Россия нападет на Америку, то получит ответный ядерный удар со стороны Франции, Англии и, конечно, Америки. Так что как бы ни была Россия велика, свою долю ядерной пыли она получит сполна в случае войны с Америкой.

Вот что я хотел сказать читателям «Народной Воли».

Григорий ШОЛОМИЦКИЙ,
житель г.Новополоцка.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Каля дарогі блізка не стала абеліска...

Вёску Паўлавічы спалілі па загадзе віцебскіх улад у 2012 годзе. А сёлета знік абеліск невядомаму салдату, які быў пахаваны паблізу вёскі ў 1941 годзе, надмагільны грудок зраўнялі з зямлёй. Пра лёс пахавання ў мясцовым сельсавеце нічога не ведаюць.

На Усход ішлі салдаты
З самых першых дзён вайны,
Адступалі, неслі страты –
Часта гінулі яны.
Пры такое калатнечы
Ямы рыць няма калі...
Ды байца па-чалавечы
Пахаваць сябры змаглі.
Уваткнуць яны паспелі
На магіле нават крыж,
Каб прыняў душу, што ў целе,
Той, хто правіць намі звыш.
Кожны міг яны лічылі –
Не пазначылі імя.
Невядома, хто ў магіле
Паміж соснамі дзвюма...
Змоўклі бітваў адгалоскі,
Стала ціха на зямлі.
Старажылы блізкай вёскі
У сасновы гай прыйшлі.
Да салдацкае магілы
Кожны з іх прыклаў руку:
Крыж папраўілі пахілы,
Кветкі ўсклалі на грудку
Прыцярушаным іглiцай,
Каб усё было як след.
Не асмеліўся ўхіліцца
Ад турбот і сельсавет:
Там, дзе крыж стаяў дагэтуль, –
Абеліск, нібы страла.
І не ўздзіў, што сельсавету
Ад вяскоўцаў пахвала.
Час ішоў. У святы кветкі
Клалі людзі на грудок,
І дарослыя, і дзеткі
Ля яго спынялі крок.
...Паўміралі старажылы,
Тая вёска – без людзей,
І ніхто ўжо да магілы
Не ідзе ў святочны дзень.
Сохнуць хаты, як шкілеты,
І быльнёг расце наўсцяж...
Неўспадоб уладзе гэты
Непрываблівы пейзаж.
Па дарозе ездзяць госці –
Блізка горад абласны.
Перамыюць потым косці
За пейзаж такі яны:
"Тут усё "пакрыта гноем",
Бо няма гаспадара,
І начальства абласное
Выганяць даўно пара..."
І з прычыны той, напэўна,
Нехта "зверху" парашыў,
Што пусціць патрэбна "пеўня"
На пейзаж каля шашы.
Бушаваў агонь праклятый,
Бы падчас былой вайны.
Як датла згарэлі хаты –
Разбурылі й каміны.
Той пейзаж на самай справе
Выглядае весялей!
...Сустракалі неўзабаве
Пераможны юбілей.
Манументы і магілы
Прывялі ў прыстойны стан.
Каля іх "распраўціць крылы",
Як падыдзе, ветэран!
І чакалі без трывогі
Светлы дзень...
Ды на табе! –
Абеліск каля дарогі,
Быццам вока у ілбе.
Ён, вядома, недарэчы,
Мовіць так, псуе абшар
Каля змрочнае пустэчы,
Што пакінуў тут пажар.
Дзень святочны вельмі блізка...
Хмурыў велькі чын чало:
"Лепш бы тога абеліска
І наогул не было..."
Дык і здзейснілася мара,
Што выношваў кіраўнік!
Не псуе цяпер абшары
Абеліск. Раптоўна знік.
Бы яго кудысьці вецер –
Ураган магутны – знёс.
Нават клеркі ў сельсавеце
Пра яго не знаюць лёс...

* * *

Апынуўся к круглай даце
Небам і зямлёй паміж
І шкадуе той салдацік,
Што калісьці знеслі крыж...

ПЫТАННЕ – АДКАЗ

Я хачу, каб сцены ў пад'ездзе былі пафарбаваны ў жоўты колер

У жыллёва-камунальнай службе мне сказалі, што ў гэтым годзе наш пад'езд будзе рамантавацца. Скажыце, калі ласка, ці могуць па маёй просьбе сцены пафарбаваць у жоўты колер?

Сцяпан ХУДКЕВІЧ.

Гродна.

Ваша просьба можа быць задаволена толькі пры ўмове, што гэта палічаць мэтазгодным спецыялісты аддзела архітэктуры раёна. Менавіта на іх ускладзена вырашэнне такога пытання. У любым выпадку сцены на ўсіх паверхах вашага пад'езда павінны быць пафарбаваны ў адзін колер.

ПОЛЕЗНЫЕ СОВЕТЫ



Как пожарить речную рыбу?

Обожаю речную рыбу! Но выбирать мелкие косточки вдоль хребта – это какое-то наказание. Все изменилось после того, как один рыбак научил меня правильно эту мелкую рыбу жарить.

Все просто – надо только у рыбки вдоль хребта сделать насечки с шагом миллиметра три. Потом я эту рыбу опускаю в пакет с мукой, солью и специями, трясу и на сковородку выкладываю.


Кстати, обваливать рыбу в муке в пакете тот же рыбак научил, за что я ему благодарна безмерно – и руки чистые, и на столе так же чисто!

Татьяна СТРЕЛКОВСКАЯ.

Минский район.

ЦІКАВА

Адкуль у Браславе масоны?



Усялякія чарнасоценцы і прыхільнікі тэорыі сусветнай змовы чым толькі не палохаюць наш народ! Асабліва любяць дэманстраваць па тэлебачанні так званыя "масонскія знакі" на долары – там, дзе выява піраміды і вока. Нядаўна ў чарговы раз убачыў такі канспіралагічны шэдэўр па тэлебачанні і проста ўжо не магу ўстрымацца ад кароткай рэплікі.

Калі "масонскія знакі" на амерыканскіх грашах – гэта доказ злавесных намераў ЗША праз долар падпарадкаваць сабе ўвесь свет, то што тады азначае герб нашага Браслава? І мы на сусветнае першынство замахнуліся?

Ды не! Гэтая выява – вока ў роўнабаковым трохвугольніку – вобраз Святой Тройцы, сімвал Бога. Вось такая "сусветная змова".

Параўнайце самі!

Міхаіл СІНЮКЕВІЧ.

Гродна.

ЧУЛІ?

Кракаў – у спісе лепшых гарадоў свету

Японскі горад Кіёта, амерыканскі Чарльстан і Сіэмрэап з Камбоджы – гэта тры найлепшыя для турыстаў гарады свету паводле аўтарытэтнага рэйтынгу амерыканскага часопіса Travel&Leasure.

Рэйтынг стварaўся паводле вынікаў галасавання саміх турыстаў у інтэрнэце. Упершыню за 20-гадовую гісторыю рэйтынгу там апынуўся польскі горад. Кракаў знаходзіцца на сёмым месцы.

У першую дзясятку ўвайшлі таксама Фларэнцыя, Бангкок, Барселона, Іерусалім.

ЛАТВИЯ

Решено увеличить военные расходы

Новый президент Латвии, бывший министр обороны страны Раймондс Вейонис считает, что в каждой из стран Балтии и Польше должно присутствовать по батальону НАТО. В то же время латвийский лидер уверен, что Риге нужно налаживать нормальные отношения с Москвой.

Как пояснил латвийский лидер, «в связи с новой ситуацией безопасности» в Латвии решено увеличить военные расходы до 2% от ВВП не к 2020 году, как намечалось ранее, а к 2018 году. В то же время страна не собирается вслед за Литвой восстанавливать срочную военную службу вместо профессиональной армии, отметил он.

ИХ НРАВЫ

Напился на банкете и умер

Государство выплатит семье китайского чиновника один миллион юаней (160 тысяч долларов по нынешнему курсу).

Ляо Йонгхуа, работавший в департаменте земельных и природных ресурсов городского округа Чэньчжоу китайской провинции Хунань, умер 8 мая 2015 года от проблем с сердцем. Смерть чиновника, скорее всего, была спровоцирована интоксикацией организма от спиртного, выпитого на банкете, сообщает South China Morning Post.


Родственники коммуниста потребовали, чтобы каждый присутствовавший на злополучном празднике внес 70 тысяч юаней в компенсационный фонд, созданный после смерти партийца.

Известно, что банкет устроило ведомство, где работал погибший. Чиновник успел выпить на празднике и даже попеть в караоке.

Но после того, как коммунист вернулся домой, его родственники заметили, что с главой семьи что-то не так. «Его лицо потемнело, и он сказал, что чувствует себя некомфортно», – поведал источник, знакомый с ситуацией. Семья спешно повезла родственника в больницу, но было уже слишком поздно.

ЭВРИКА!

Компания Boeing запатентовала термоядерный авиационный двигатель



На минувшей неделе бюро патентов и торговых марок США выдало компании Boeing патент на авиационный двигатель, работающий за счет энергии небольших термоядерных взрывов, сообщает издание Business Insider.

Согласно описанию, установленные внутри двигателя мощные лазеры фокусируются на радиоактивном материале – дейтерии и тритии, который подается в камеру сгорания. Под воздействием лазеров в камере происходит небольшой термоядерный взрыв. Затем высвобожденные в результате этого взрыва частицы водорода или гелия с колоссальной скоростью вылетают через специальное отверстие, создавая мощную реактивную тягу.

СТОП-КАДР



Цяжкі дыялог. Кітай і ЗША выпрацоўваюць правілы на выпадак канфлікту...



Кітай. Трэніроўка паліцэйскіх.

ПАРАЛЛЕЛИ

Музей сказок на Юргордене

Когда первый раз приезжаешь в незнакомую страну, всегда обуревает желание увидеть то, чего у нас нет. Вдруг чужой опыт будет полезен? Не так давно оказалась в Стокгольме, городе, который давно хотела увидеть. Всем советую. Столица Швеции выглядит действительно по-королевски. Красота необыкновенная! Архитектура, море, заливы, яхты... Как не влюбиться в такую столицу?! Но сегодня хотелось бы поговорить не столько об архитектурных красотах Стокгольма, столько о самобытных музеях, в которых все организовано на удивление просто и умно. Эффект – потрясающий! Речь о Музее сказок на острове Юргорден и Музее группы АББА.





Чем занять ребенка?

Сначала вопрос читателям, среди которых немало родителей детей-дошкольников или дедушек-бабушек, у которых есть внуки. Если на дачу или в деревню далеко, куда можно отправиться с дошкольниками в выходной или в праздник? Ответ приходит сам – песочница около дома. Или парк Горького (Челюскинцев, Лошица). Но это через два-три раза становится привычным, а потому неинтересным. Чем занять ребенка – вопрос не праздный, а глобальный. Родители должны решать его каждый выходной, на каникулах и в праздники.

Что сделали шведы? На острове Юргорден (это центр Стокгольма) почти у воды стоит обычный одноэтажный дом без каких-либо наворотов. Он пользуется невероятной популярностью! У входа длинный ряд прогулочных колясок. Это музей для детей от 2 лет и старше.

Входной билет стоит 159 крон (это почти 300 тысяч белорусских рублей). Недешево, но и уровень жизни в Швеции выше. Первое просторное помещение – для малышей. В какой-то момент жалеешь, что не можешь вместе с детьми залезть по лесенке на крышу двухэтажного домика и съехать с горки. Или взобраться на корабль – и тоже вниз. Рядом миниатюрное кафе, за игрушечной кассой девочка 4–5 лет, у входа ее ждет бабушка. Соседний домик – столярная мастерская с набором инструментов и гвоздиками-шурупчиками. Рядом магазин ювелирных украшений для маленьких модниц. У входа Волк – большой, худой и грустный.

Если домик, то в нем окошки подсвечены изнутри. Черепичные крыши, изогнутые мостики, клумбы с цветами. Невольно задумываешься: а почему у нас во всех микрорайонах, кварталах элитной и обыкновенной застройки на детских площадках абсолютно одинаковые качели, карусели, горки? Как под копирку! Не хватает краски, металла или фантазии? Но ведь каждый год вузы выпускают инженеров, педагогов, дизайнеров. Где они? Не хватает своих – давайте шведов попросим! Пускай поделятся опытом, как соорудить такие нужные и полезные конструкции.

Следующий зал – путешествие по сказкам Астрид Линдгрен, ее мы знаем в основном как автора «Малыша и Карлсона» и «Пеппи». Первая книга имела в советские времена фантастическую популярность. Даже теперь в Беларуси и странах СНГ периодически ставят драматические и кукольные спектакли по этому произведению. Как ни странно, но в Швеции нет культа Карлсона, его не увидишь в сувенирных лавках. Считается, что он – плод фантазии мальчика, а значит, не совсем реальный персонаж. Шведы больше ценят Пеппи, веселую, с торчащими в стороны рыжими косичками. Ее изображений много. Игрушки, куклы, открытки. Сказка «Пеппи Длинныйчулок» активно переводилась. В одном из следующих залов я видела полки, уставленные книгами Линдгрен на разных языках. Тут же ее сказки на CD и DVD-дисках.

Интересно, что любимым персонажем писательницы была не Пеппи, а девочка по имени Мадикен. Она – главное действующее лицо книги «Мадикен и Пимс из Юнибаккена». По имени ее дома и назвали музей. Когда едешь в подвесной кабине по стране сказок, замечаешь, с какой любовью сделаны дома, деревья, миниатюрные фигурки взрослых и маленьких персонажей. Хочется потом найти эти книги и прочитать. Визуализация героев, конечно, пробуждает интерес к ним.

У них и у нас

Один из залов музея отдали под магазин. В больших плетеных корзинах игрушки. Может, и не купишь, но в руках подержишь, такие они привлекательные. Оформление зала – постеры и иллюстрации к детским книгам, сделанные шведскими художниками.

Планировала провести в Музее сказок час. Когда вышла, оказалось, прошло два с половиной. Уходить не хотелось. Тем более что в одном из залов музея шел спектакль, в котором были заняты актеры-подростки, а зрители возрастом помладше сидели на ковре и внимательно смотрели. Музей выполняет множество функций. Это огромная игровая, книжный магазин, выставка работ художников, сценическая площадка, музей кукол – персонажей сказок. Наконец мультимедийный объект.

Ходила по музею и думала: вот бы в Минске, где население почти 2 миллиона, было бы что-нибудь похожее! Ведь у нас огромное количество народных сказок, героев которых могли бы визуализировать белорусские художники. Сказки Коласа, Бядули, Лынькова, Витки и многих ныне живущих авторов... Подобный музей может быть и не один! В каждом областном городе он не помешал бы. Это же просто! Не нужны хрустальные люстры, дорогая плитка, росписи. Нужна только фантазия, вкус и забота о детях. Если воспитывать подрастающее поколение таким образом и не жалеть на это средств и сил, привлекать самых умных и талантливых педагогов, художников, артистов, то, вероятно, будут не нужны огромные штаты правоохранительных органов.

Что экспортируют шведы?

Умение гордиться соотечественниками, яркими явлениями собственной истории и культуры – с этим в Стокгольме я сталкивалась постоянно. Еще один пример. Недалеко от Музея сказок находится Музей группы «АББА». Билет –195 крон (360 тысяч на наши деньги).

Часть здания музея, созданного всего два года назад, занимает магазин. Чего там только нет! Все для фанатов: книги, альбомы, диски, видео, майки, зонтики, шапки, носки, бокалы. Все, на что можно нанести логотип. В музее можно взять наушники и послушать экскурсию на своем языке.

Казалось бы, давно прошло время взлета группы (она существовала в 1972–1982 годах). Записей «АББА» продано по всему миру более 350 миллионов экземпляров. Они остались в плей-листах радиостанций, их альбомы востребованы по сей день. С победы на «Евровидении» с песней «Ватерлоо» прошло тридцать лет! Тем не менее страна гордится ими до сих пор. Вслушайтесь в смысл следующей фразы, которая не однажды звучала во время экскурсии по Стокгольму: *«Шведская музыка – главная в стране статья экспорта».* Не тракторы, не автомобили, не калийные удобрения, не нефть и не газ. А интеллектуальный продукт. Планируется, что в ближайшие годы такой же статьей экспорта станет и шведский дизайн. При том что магазины «ИКЕА» уже завоевали города многих стран мира.

***

О многом заставляет задуматься Стокгольм. Но главное... Чтобы «продвигать» свою литературу, музыку, историю, надо для начала уметь ими восхищаться, их знать и любить. Тогда ими восхитится весь мир. Тогда туристы приедут посмотреть на них и оставят в стране валюту. Чем не подсказка для белорусских идеологов?

Ксения МИХАЙЛОВСКАЯ.
Фото автора.

ГЕАПАЛІТЫКА

Іран больш не з'яўляецца ізгоем

Дамова па іранскай ядзернай праграме дасягнута. Крызіс вакол супярэчлівай ядзернай праграмы Ірана цягнуўся 12 гадоў.

Іран і шэсць сусветных лідараў – Германія, Францыя, Кітай, ЗША, Вялікабрытанія і Расія – дасягнулі заключэння гістарычнай ядзернай здзелкі, якая прадугледжвае адмену міжнародных санкцый у дачыненні да Тэгерана ў абмен на абмежаванне яго ядзернай праграмы.


«Уся цяжкая праца была недарэмнай», – прыводзіць агенцтва Reuters словы неназванага іранскага дыпламата.

Перамовы ў аўстрыйскай сталіцы працягваліся больш за два тыдні.

Заходнія краіны вінавацілі Іран у спробах стварыць ядзерную зброю, Тэгеран адмаўляў такую мэту сваёй ядзернай праграмы. Супрацьстаянне з гэтай нагоды працягвалася больш за 12 гадоў.

Пасля вырашэння гэтай спрэчкі з Ірана будуць зняты заходнія санкцыі, у тым ліку на міжнародны рынак патрапіць іранская нафта. Апошняе можа выклікаць яшчэ большае падзенне цэн на нафту. Так што доўгачаканая для ўсяго свету навіна наўрад ці радасная для Расіі...

СТОП-КАДР



Рыбны рынак у Афінах чакае пакупнікоў.



Гэты здымак абышоў многія выданні. Ён зроблены на традыцыйным забегу быкоў у іспанскім горадзе Памплона. У першы ж дзень тры чалавекі атрымалі сур'ёзныя траўмы, восем – раненні сярэдняй цяжкасці.

ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ

В штате Вашингтон обнаружили девушку, выжившую при падении легкомоторного самолета

16-летнюю Оутемн Витч обнаружил автомобилист, который отвез девушку к ближайшему торговому центру. По словам местного шерифа, Оутемн несколько дней провела в гористой местности, пытаясь найти дорогу.

В настоящее время девушка находится в больнице, ее состояние стабильное. При этом до сих пор нет информации о еще двух человеках, находившихся на борту самолета, – бабушке и дедушке Витч. Все, что пока рассказала девушка о крушении самолета, – он упал сразу после выхода из облаков.

Об исчезновении легкомоторного самолета стало известно в субботу. Он должен был прибыть в город Линден, штат Вашингтон, однако связь с ним была потеряна.

Австралия призвала Совет Безопасности ООН поддержать создание международного трибунала для расследования крушения пассажирского "Боинга" на востоке Украины

По мнению министра иностранных дел страны **Джули Бишоп,** международный трибунал станет символом того, что международное сообщество не будет терпеть угрозы миру и безопасности. Бишоп полагает, что трибунал поможет обеспечить международную поддержку стороне обвинения и расширит возможности для международного сотрудничества по этому делу.

3 июля с инициативой создания международного трибунала выступила Малайзия. Эту инициативу поддержали Нидерланды.

Россия отреагировала на это предложение резкой критикой. Замглавы российского МИД **Геннадий Гатилов** заявил, что Москва считает эту идею несвоевременной и контрпродуктивной.

США рассматривают планы обучения украинской армии

Соединенные Штаты рассматривают план расширения обучения украинских вооруженных сил, заявил командующий американскими силами в Европе генерал **Бен Ходжес.**

Сейчас на Украине находятся 305 американских военнослужащих, которые в качестве советников и инструкторов осуществляют военную подготовку подразделений украинской национальной гвардии, подчиняющихся Министерству внутренних дел Украины. В случае одобрения этих планов Белым домом обучение украинской регулярной армии начнется в ноябре. По словам генерала Ходжеса, среди прочего американские советники обучают украинцев способам ведения радиоэлектронной борьбы с целью защиты средств связи и управления боевыми действиями от атак противника.

Командующий американскими войсками в Европе также сообщил о том, что у него есть данные о продолжении военных поставок силам сепаратистов на востоке Украине с территории России. Он предупредил о том, что сепаратисты могут готовиться к новому наступлению.

Мексика: 4 миллиона долларов за информацию о сбежавшем наркобароне

Самый известный преступник страны в ночь на воскресенье сбежал из тюрьмы строгого режима. Это уже второй его побег. Почти 50 сотрудников тюрьмы, включая директора, задержали и сейчас проверяют на предмет возможного сговора.

15-й кандидат от республиканцев на пост президента США

Губернатор штата Висконсин Скотт Уокер вступил в борьбу за пост президента США от Республиканской партии. Об этом политик сообщил в видео на YouTube. В своем обращении Уокер написал:

"Я вступаю в президентскую гонку, потому что американцы заслуживают лидера, который будет бороться и победит ради них". Уокер родился в штате Колорадо в 1967 году. Он женат, у него двое детей.

НА ЭКРАНАХ

Наш адказ Галівуду



Нядаўна скончыліся здымкі першага беларускага сіткома «ГараШ». Жанр фільма пазначаны як чорная камедыя. Гэта будзе своеасаблівы адказ галівудскім і расійскім серыялам накшталт «Доктара Хаўса» і «Інтэрнаў».

Карціна пра сапраўднага беларуса з тонкасцямі яго псіхалогіі і яго поглядамі на жыццё. У фільме будзе не толькі гумар, але і драма, а месцамі нават элементы містыкі і хорару. Гэтакая сатыра на "саўковае" мысленне пры яго сутыкненні з мысленнем заходнім.

Ідэя стварэння фільма нарадзілася ў кампазітара **Дзмітрыя Фрыгі**, які захацеў стварыць цікавае кіно насуперак тым, хто толькі жаліцца, што нічога нельга зрабіць без грошай. Сваёй ідэяй ён падзяліўся з аператарам-пастаноўшчыкам **Аляксандрам Крупінай** і вядомым беларускім сцэнарыстам **Андрэем Курэйчыкам** (аўтар сцэнарыяў паспяховых расійскіх фільмаў «Любовь-морковь», «Елки», «Юленька» і інш.). Андрэй Курэйчык і напісаў сцэнарый да фільма.

Дзеянні камедыі разгортваюцца на ўскраіне Мінска ў мікрараёне "Шабаны" (таму і "Ш" на канцы назвы фільма). Маладога беларуса (ролю выканаў акцёр Тэатра беларускай драматургіі **Арцём Курэнь**) пасля пяці гадоў амерыканскага жыцця па прычыне няверна аформленых дакументаў дэпартавалі з ЗША, дзе ён працаваў у аўтасэрвісе па праграме Work & Travel. Ён вымушаны вярнуцца ў Мінск, дзе ўладкоўваецца на работу ў гаражную аўтамайстэрню ў Шабанах. Але ўсё не так проста. Яго амерыканскія дыпломы і рэкамендацыйныя лісты тут нікому не цікавы. Куды важней тое, што ён можа рабіць рукамі і як ён зарэкамендуе сябе сваёй работай. «Прабач, але гэта Беларусь», – кажа яму з сарказмам галоўны герой, які кіруе гэтым гаражом. Ролю галоўнага героя выканаў **Аляксандр Куллінковіч,** вядомы беларускі рок-музыкант, вакаліст групы «Neuro Dubel». Па сюжэце фільма ён нарадзіўся ў Шабанах, тут вырас і большасць свайго часу праводзіць у гаражы.

Але ідэя фільма хутчэй не пра гараж і яго неардынарных працаўнікоў. І нават не столькі пра Шабаны. Ідэя пра любоў да таго месца, дзе ты нарадзіўся.

Здымкі фільма праходзілі як у Шабанах, так і ў іншых раёнах Мінска. Праца ішла ў аўральным рэжыме, людзі працавалі па 15 гадзін у суткі, з раніцы да позняй ночы. Куллінковіч, які выконвае ролю галоўнага героя, пасля завяршэння здымак напісаў на сваёй старонцы ў "Фэйсбуку": *«Я так ніколі не стамляўся. Спусташэнне поўнае. Сказаць, што задаволены, – змяніць. Я вельмі задаволены. Сказаць, што ўдзячны, – гэта таксама маленькая хлусня. Я вельмі ўдзячны. Я яшчэ ніколі не бачыў, каб гэтакая колькасць людзей працавала ў такім парыве».*

Плануецца, што на выхадзе атрымаецца карціна амерыканскага фармату прыкладна на 45 хвілін. Арыенціровачна фільм выйдзе ў пракат ужо ў верасні гэтага года. Плануецца серыя кінапрэм'ер у беларускіх кінатэатрах, а затым фільм адправіцца ў фестывальны тур, пасля чаго будзе прапанаваны айчынным тэлеканалам.

Алег ГРУШЭЦКІ.

ПРЭМ'ЕРА!

Украінскі канфлікт – на мінскай сцэне?

Мінчане выбіраюць п'есу, якую хочуць убачыць на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Ці можа глядач выбраць п'есу, якую абавязкова паставяць на сцэне любімага тэатра? Бадай, толькі ў двух выпадках. Або калі гэты глядач – уплывовы чыноўнік. Або калі ён сябруе з галоўным рэжысёрам (а яшчэ лепш – з яго жонкай). Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі вырашыў змяніць правілы. Ужо зараз наведвальнікі РТБД могуць самі выбраць п'есу, якую хочуць убачыць на сцэне.

Яшчэ вясной гэтага года ў Беларусі прайшла "Міжнародная драматургічная лабараторыя" (ужо чацвёртая па ліку), якую арганізавалі Цэнтр беларускай драматургіі і тэатральна-канцэртнае агенцтва "Культпрасвет". Айчынныя драматургі і рэжысёры краін СНД падзяліліся на пары і цягам тыдня стварылі п'есы, якія потым дапрацоўваліся. Тэмы самыя розныя – містычная гісторыя пра героя, які чытае сваёй дачцэ начныя казкі (прычым кожная з іх адлюстроўваецца ў сюжэце), гісторыя пра адзіноту і чалавечыя ілюзіі і нават абсурдная п'еса пра сабак. Кожная з васьмі напісаных п'ес можа быць пастаўлена ў РТБД.

Найбольшую цікавасць з прапанаваных тэстаў выклікае п'еса "Опіум", прысвечаная тэрарызму і вайне ва Украіне. Яе аўтары – драматург **Віталь Каралёў** і рэжысёр **Міхаіл Угараў**. Дарэчы, сваю першую п'есу ("Участковыя") Каралёў напісаў, грунтуючыся на ўласным досведзе (ён шэсць гадоў працаваў дзяжурным у адным з аддзяленняў мінскай міліцыі). Пасля напісання нават вывесілі яе на форуме ўчастковых. Віталь сцвярджае, што водгукі былі станоўчыя.

"У суседняй краіне ідзе вайна, – кажа Каралёў пра свой новы тэкст. – *У большай або меншай ступені, ускосна або глабальна гэта ўплывае на нас. На пачатку года я напісаў эскіз п'есы – пяць сцэн пра вайну. На лабараторыі яе прачытаў куратар – **Міхаіл Угараў.** Ён палічыў такую тэму актуальнай. Разам мы прыдумалі цалкам новы сюжэт і персанажаў".*

Угараў вядомы як расійскі драматург, рэжысёр і сцэнарыст. Яго самая скандальная пастаноўка – «Гадзіна васямнаццаць», якая была пастаўлена маскоўскім Тэатр. doc. У аснове спектакля – рэальная гісторыя маскоўскага юрыста **Сяргея Магніцкага**. У 2007 годзе ён раскрыў буйную аферу, з-за якой дзяржава штогод губляла велізарныя грошы. Магніцкі быў арыштаваны, правёў год у турме. Там стан яго здароўя рэзка пагоршыўся. Нягледзячы на сімптомы вострага панкрэатыту, яму на працягу адной гадзіны і васямнаццаці хвілін не была аказана неабходная дапамога, з-за чаго юрыст сканаў. Дарэчы, пазней ЗША прынялі "закон Магніцкага". У ім уводзіліся персанальныя санкцыі ў дачыненні да людзей, датычных да парушэнняў правоў чалавека ў Расіі.

Восем п'ес, а таксама ролікі-анатацыі выкладзены на сайце *kultprosvet.by*. Там жа адбываецца галасаванне, якое працягнецца да 13 ліпеня. Ужо вядома, што п'еса-пераможца будзе пастаўлена восенню на сцэне РТБД і ўвойдзе ў праграму фестывалю ТЕАРТ.

Такая ініцыятыва не магла ажыццявіцца без згоды дырэктара РТБД **Уладзіміра Карачэўскага.** Уявім, што п'еса пра Украіну набярэ большасць галасоў. Ці пагодзіцца былы першы намеснік міністра культуры ставіць спектакль на украінскую тэматыку?

Але канчатковае рашэнне – за журы, якое абвясціць сваё рашэнне 17 ліпеня. Бо гледачы выбіраюць толькі тройку пераможцаў для разгляду прафесіяналаў. Зрэшты, сталіца Беларусі ўжо стала месцам падпісання двух Мінскіх пагадненняў, якія паспрабавалі спыніць баявыя дзеянні ва Украіне. Можа, гэтым разам міратворчыя функцыі выканае мастацтва?

Максім ПЛОТНІКАЎ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Гімназіст з Гродна перамог у тэлешоу «Умницы и умники»



Выпускнік Гродзенскай гарадской гімназіі Мікіта Валковіч перамог у расійскім тэлевізійным інтэлект-шоу для школьнікаў. Цяпер юнак паступае без іспытаў у самую прэстыжную ВНУ Расіі – Маскоўскі інстытут міжнародных адносін.

У фінальным шоу ўсе ўдзельнікі былі пастаўлены ў аднолькавыя ўмовы: трэба было адказаць на тры пытанні, памыліцца можна было толькі адзін раз. [illegible]

ЧУЛІ?

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» ўзначаліў паэт Алесь Бадак

Папярэдні дырэктар Уладзіслаў Мачульскі прасядзеў у гэтым крэсле з 2002-га па 2015 год.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» было заснавана ў 1972 годзе. Тут выходзяць дзясяткі кніжак на беларускай мове. Найбольш гэта выданні, якія фінансуюцца Міністэрствам інфармацыі. [illegible]

НОВЫЕ ИМЕНА

Сергей ТАНАЩУК:

«Красивая девушка меня точно вдохновит...»

*В Международном конкурсе художников, который недавно прошел в Астане, студент Полоцкого университета **Сергей ТАНАЩУК** участвовал впервые. Из 70 заявленных работ его картина была удостоена диплома II степени. «Народная Воля» побеседовала с молодым художником из Новополоцка.*



– Сергей, давно вы пишете картины?

– Началось все с детства и со временем переросло в профессиональное занятие. Я закончил художественную школу, обучался у профессиональных художников... Одним словом, развивался в творческом направлении. Поступил в Академию искусств, но не набрал нужного количества баллов. Первое время переживал, что не прошел конкурс, а потом понял, что диплом и знания это не одно и то же. Сейчас обучаюсь в Полоцком университете на инженерно-строительном факультете по специальности «Дизайн». Параллельно с учебой занимаюсь самообразованием. Написание картин – дело всей моей жизни. Художником от рождения себя не считаю и мнение, что талантами рождаются, не разделяю. Над успешным результатом нужно очень много работать.

– В роду художники были?

– Родственников, которые занимались бы исключительно искусством, у меня нет. Хотя мама говорит, что мой дедушка тоже пытался писать, даже сохранилась его большая старая картина. Но это, скорее, был любительский уровень. Родители поддерживают мои начинания в искусстве и придерживаются мнения, что человек должен заниматься тем делом, которое по душе.

– Участие в Международном конкурсе художников в Астане – ваш первый международный опыт?

– Да. Конкурс проходил в столице Казахстана и был приурочен к 70-летию Победы в Великой Отечественной войне. В Астане было представлено 70 работ из 14 стран мира. Моя работа заняла второе место, и результат, признаюсь честно, неожиданный. Мой руководитель Андрей Анатольевич Пискун предложил поучаствовать в конкурсе, и я согласился, без особой надежды на победу. Планировал просто получить сертификат об участии в Международном конкурсе художников. Я испытал шок, когда позвонил Анатолий Ничиков и сообщил, что моя работа удостоена диплома второй степени на таком серьезном конкурсе.

– Какие были требования к работам?

– Тематика должна была соответствовать празднику Победы, а представленные работы – высокому профессиональному уровню, то есть мероприятие позиционировалось как конкурс не для студентов-любителей, а для уже состоявшихся художников. Организатором конкурса выступал Центральный клинический госпиталь Казахстана для ветеранов. Я представил картину, на которой изображена моя двоюродная бабушка – военный врач, ветеран войны, Герой Советского Союза Зинаида Михайловна Туснолобова-Марченко.

Я оказался в тесных временных рамках (на картину у меня ушло около месяца), потому что мы поздно подали заявку на участие. Писал каждый день в университете, мне пошли на уступки и даже снимали с некоторых занятий. Руководство ПГУ мне очень помогло, в том числе и материально. За счет университета картина была отправлена в Казахстан, за что я очень благодарен. Также мне выдали премию в 500 тысяч рублей, несмотря на то, что я учусь на платном отделении. Огромное спасибо моему руководителю Андрею Анатольевичу, без его участия и усилий такого результата не было бы! Он в меня верил и знал, что я не подведу, так и вышло.

– Сколько времени в день вы стоите у мольберта?

– По-разному. Для того чтобы обучаться живописи, не обязательно сутками пропадать в мастерской. Главное – быть внимательным к окружающему миру. Нужно постоянно наблюдать и анализировать происходящее, чтобы в дальнейшем перенести в конкретную работу. Безусловно, я оттачиваю технику и мастерство, но и перерывы у меня случаются. Каждая моя работа должна быть лучше предыдущей – придерживаюсь такой позиции.

– Какую технику используете при написании картин?

– Пишу только в классическом стиле и масляными красками. Я не отдаю предпочтение какой-то отдельной технике. Есть любимые художники и работы, которые меня вдохновляют. Один из них Ван Гог со своей специфической техникой и чистой живописью. В картине, которая была представлена в Астане, я пытался ориентироваться на Рембрандта с его знаменитыми портретами.

– А кроме знаменитых мастеров что может вдохновить?

– Вдохновение иногда спонтанно, а бывает, его вообще нет. Здесь много разных нюансов, которые могут подтолкнуть к написанию картины... Очень красивая девушка меня точно вдохновит *(смеется)*.

– Сегодня можно зарабатывать на жизнь продажей картин?

– Возможно, но очень трудно. Художников, которые живут за счет своих работ, единицы. Не всегда картину можно удачно продать или вообще найти на нее покупателя. [illegible] Но на всякий случай у меня будет профессия дизайнера...

– А мнение, что талант должен быть голодным, разделяете?

– Нет, лучше работать на сытый желудок. Хотя в истории достаточно примеров, когда великие мастера жили впроголодь и в нищете, но были преданы делу. Думаю, что если уж встал на этот путь, то не стоит опускать руки, какие бы трудности ни одолевали. В том числе и материальные. Можно сделать какую-то паузу, но все равно вернуться к творчеству. Для художника, мне кажется, важнее признание, чем деньги.

– Сергей, а молодежь сегодня интересуется искусством?

– Я думаю, оно интересно только тем, кто непосредственно с ним связан. Мало тех, кто посещает художественные галереи и получает эстетическое удовольствие от увиденных работ.

– Над чем сейчас работаете?

– Есть идея создать масштабную картину, связанную с личной темой. Часть моего детства прошла в Украине в старой деревушке, и мне хотелось бы следующую картину посвятить моим родственникам, которых уже нет. Это будет большое полотно, на котором я хочу изобразить пышное староукраинское застолье, которое было в реальной жизни, но очень давно. Ну и, конечно, нужно развиваться, работать, участвовать в конкурсах и побеждать.

Роман ВАСЮКОВИЧ.


ЗАКУЛИСЬЕ

Тео не собирается больше на «Евровидение», а Руслан Алехно такой возможности не отрицает

Об этом артисты рассказали на пресс-конференции в фестивальном Витебске. Говоря о своем участии в витебском форуме, артисты заявили, что с удовольствием приехали бы в фестивальную столицу с сольными концертами (и при этом пообещали петь исключительно вживую), но пока участвуют в сборных.

Разговор шел не только о творчестве, но и о личном. Журналисты выясняли кулинарные предпочтения – оказалось, что оба героя встречи любят котлеты, а Руслан Алехно с удовольствием готовит для друзей плов, красный борщ и тройную уху (рыбу для которой предпочитает ловить сам). Певец подтвердил информацию о том, что после развода купил квартиру в Москве и уже отметил там новоселье, а отдыхать в этом сезоне он собирается на Алтае.

Третьей участницей звездного часа должна была стать Анжелика Агурбаш, но заслуженная артистка Беларуси на встрече так и не появилась, что было объяснено чрезмерной занятостью.



ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Альманах салідарнасці

Нядаўна ў амбасадзе Украіны прайшла прэзентацыя першага нумара альманаха "Справа". Ён стаў вынікам працы літаратараў, якія год таму, у красавіку 2014-га, аб'ядналіся ў Таварыства ўкраінскай літаратуры пры ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Беларускія ініцыятывы для Украіны

Год працы Таварыства – гэта і самы цяжкі год у найноўшай гісторыі Украіны. Год барацьбы за самастойнасць, сапраўдную незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць. Як казалі на прэзентацыі стваральнікі Таварыства, іх справа распачалася менавіта як пошук нейкага творчага адказу на тыя праблемы, якія сёння ёсць у нашага братняга народа, праява салідарнасці ды спроба наладзіць шляхі ўзаемаразумення.

Зрэшты, украінскія падзеі яскрава прадэманстравалі, што беларускі народ па-рознаму, але спрабуе дапамагчы паўднёвым братам, а таксама разбурыць існуючыя прапагандысцкія міфы. З боку ўлад гэта мінскія перамовы ды мінскія пагадненні, месца сустрэч для кантактных груп. Экспертная, аналітычная супольнасць распрацавала і прасоўвае ініцыятыву "Мінскі дыялог" (у фармаце другога трэка дыпламатыі). Хапае і ініцыятыў грамадзянскай супольнасці – напрыклад, праект «Украіна–Беларусь: адзінства ў разнастайнасці», у межах якога праходзілі "круглыя сталы" для прамога абмену інфармацыяй паміж украінскай і беларускай моладдзю. І вось цяпер перад намі літаратурна-мастацкі праект.

Мовы ўзаемапаразумення

Аўтарамі альманаха сталі людзі з розным мастацкім досведам і нават рознымі мовамі. Так, альманах "Справа" аб'ядноўвае тэксты на беларускай, украінскай і рускай мовах, а таксама на розных дыялектах, брэсцка-пінскіх гаворках беларуска-ўкраінска-польскага памежжа. Вось каму не трэба тлумачыць, што беларусы і ўкраінцы – братэрскія народы, дык гэта жыхарам памежжа, якія праз уласную мову адчуваюць, колькі ў нас агульнага і як лёгка зразумець адзін аднаго.

У дыялектнай частцы альманаха можна пабачыць і фрагмент кранальнай жыццёвай аповесці Фёдара Клімчука "Яныс" (гаворка сяла Сіманавічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці), і аповеды Пятра Куліка (заходнепалескі дыялект).

Асабліва кранае яго гісторыя "Ек крала я картоплы в колкозы". На паўтары старонкі аўтар адлюстроўвае тыя пасляваенныя цяжкасці жыцця палешукоў, якія хаваюцца за бравурнымі афіцыйнымі штампамі кшталту "краіна адраджалася пасля вайны". Тут і жыццё шматдзетнай маці без мужа – ды не забітага немцамі альбо паліцаямі, а забранага "сваімі" ж, "за спекуляцыю"; тут і прымусовая калектывізацыя з працай на калгас за мізэрны заробак – "а на другій рік, ек була хвора, то шэ й осталася должна колкозу"; і сама метафарычная гісторыя пра крадзеж калгаснай бульбы, якая, схаваная пад адзеннем нават на горле, гераіню ледзь не задушыла. Арыгінальная дыялектная паляшуцкая мова надае тэксту каларыт, нібыта ператварае літаратурны твор у жывую гаворку з жанчынай гэткай цяжкай долі.

«Я жыву ў краіне, у якую не верыць ніхто»

Як ужо адзначалася, альманах складаецца з твораў вельмі розных пісьменнікаў, але, безумоўна, агульнае ў іх – гэта любоў да Радзімы і мовы. Гэтым тэмам і прысвечаны шмат якія з прадстаўленых твораў. Ёсць і наўпростава вельмі актуальныя, у якіх адбіваюцца нядаўнія падзеі. Так, напрыклад, Ігар Тумаш прадстаўляе сваю рускамоўную замалёўку з пахавання Міхаіла Жызнеўскага – беларуса, які загінуў на Майдане, пад назвай "Траурная лента и сопутствующие размышления". Альбо тэкст журналісткі Дар'і Касценка, стваральніцы маскоўскай валанцёрскай групы "Рука Москвы", якая дапамагае ўкраінцам у зоне АТА. Як заўсёды, асабістыя гісторыі вельмі кранальныя і прымушаюць задумацца, як нават тыя, хто гуляе ў элітарныя інтэлектуальныя гульні, могуць апынуцца па розныя бакі барыкад:

"Министр иностранных дел" ДНР, Александр Кофман, когда-то играл в "Что? Где? Когда?". Как и я. И Док. И Женька. И Друже. Мы с ними пели вместе в лесу у костра, давным-давно, на фестивале интеллектуальных игр в Гомеле. А теперь его "соратники", в лучшем случае, расстреляли бы нас на месте. Док и Друже Максимович – в "расстрельных списках" ДНР, а нас с Женькой – за компанию. Это трудно уместить в голове".

Асобная значная частка кнігі – гэта блок "Пераклады/Переклади": беларускіх пісьменнікаў – на ўкраінскую мову, а ўкраінскіх – на беларускую. Адкрывае яго ўрывак з кнігі Святланы Алексіевіч "Час second-hand", які на ўкраінскую пераклала кіраўнік Таварыства ўкраінскай літаратуры Наталка Бабіна. Побач – найпрыгажэйшая паэтычная гульня, калі адны з самых папулярных сучасных літаратараў нашых народаў Сяргей Жадан і Андрэй Хадановіч перакладаюць вершы адзін аднаго. Чытаючы іх, можна вельмі выразна заўважыць, як шмат у нашых народаў агульнага. Вось, напрыклад, радкі верша Сяргея Жадана ў перакладзе з украінскай Андрэя Хадановіча:

Не разумеючы, што да чаго,
не цямячы, дзе й нашто,
усё ідзе, як павінна ісць,
ідзе сабе як ідзе.
Я жыву ў краіне,
у якую не верыць ніхто,
і размаўляю мовай,
якую не разумеюць нідзе.

***

Альманах "Справа" дапамагае беларускаму і ўкраінскаму народам не толькі больш даведацца пра літаратуру адзін аднаго, але ж і адчуць подых мастацкай салідарнасці, якая здольна разбураць прапагандысцкія міфы і штучныя бар'еры паміж братамі. Часам здаецца, што такая праца – гэта толькі кропля ў акіяне супярэчлівага інфармацыйнага шуму, але ж, як кажуць, што такое акіян, як не мільён кропель?

Вадзім МАЖЭЙКА.
Фота Вікі ТРЭНАС.

АПАВЯДАННЕ

Валер САНЬКО

Наперад! Ур-а-а-а!!!

Інваліду другой групы Вялікай Айчыннай вайны з 1946 года, бацьку (айчыму) Мікалаю Мікітавічу Скуцэню (1920 –1997)

Артылерыйская падрыхтоўка закончылася. Выбухі снарадаў і авіябомбаў па лініі нямецкіх акопаў і траншэй пасунуліся назад, заціхлі. Чырвонаармейцы ляжалі, у атаку не паднімаліся.

– Слухай маю каманду! На-пе-э-эра-ад! Ура-а-а!! – паўторная каманда.

Байцы ляжалі.

Гучныя і рэзкія, глухія і пісклявыя каманды гучалі тут і па баках, поклічна пішчалі свісткі, а салдаты ляжалі.

Наступленне працягвалася другі дзень, атакі праводзіліся ў розных месцах палка і дывізіі.

Чарговы раз за гэтыя два дні мусілі чырвонаармейцы паднімацца ва ўвесь рост, бегчы наперад, бегчы пад варожым агнём, кметкім, густым. Адкочваліся назад не ўсе. Цяпер салдаты ляжалі – то бок стаялі ў брустверах і акопах, прыціскаліся да зямлі ў траншэях, напружаныя, суровыя, глухія да ўсяго ваколля. Не пазіралі адзін на аднаго.

Дзесьці далёка ў тыле адной і другой супрацьлеглых армій вялікія і маленькія начальнікі і начальнічкі, кемкія і разумныя, тупаватыя і зусім дурныя, склалі вялікі добры план наступлення і абароны. Яны рашылі за палкі, дывізіі. Разлічылі агнявыя сродкі, магчымасці тылу, колькасць танкаў і самалётаў. Выбралі найспрыяльны час наступу, абароны, правялі інжынерную разведку мясцовасці і разведку войск боем.

Настаў гаркэчны пякельны час, усё сышлося тут, бліз возера Балатон, планы і мары, парыванні і засцярогі – у батальёне, нават не ў батальёне – роце, узводзе.

Яфрэйтар Мікалай Макарэня ляпнуў па спіне Мыколу Цывулю, заспакойна глянуў на Віцьку Каланчу. У яфрэйтара, як і ў кожнага вопытнага байца, пад апекаю па два-тры навічкі. Ні слова паміж траімі. Другі тыдзень маладзесенькія ўкраінскія хлопцы ва ўзводзе, самы дарагі для іх гэты беларус.

Напозаддзі бухнуў снарад.

– У час першага артабстрэлу я крычаў "Мама!". У сорак першым. Пад Кіевам. – Паменела напругі на тварах навічкоў узбоч яфрэйтара, яго словы для іх цёплы кампрэс. – Нічога, брацця, пераможам. Сусед таксама "мама" крычаў.

Ніводзін баец з усіх трох узводаў роты старшага лейтэнанта Валянціна Іванова не паднімаўся пад кулі ворага, здавалася, поўнасцю ашаломленага артпадрыхтоўкаю і штурмоўкаю авіяцыі. У ціха-сціхасці мільгатнуліся секунд дзевяць, дванаццаць, пятнаццаць, доўгіх невыказна цяжэрных секунд, дзевятнаццаць, трыццаць, байцы не рушыліся. Прыклеіліся да зямлі.

Узводны Карп Перабінос не вытрываў гнёткай цішыні пярэдняга краю, выскачыў пад агонь ачунялых нямецкіх траншэй, узмахнуў наганам на немцаў. Крыкнуць украінец нічога не паспеў. Упаў, загрэбаў зямлю рукамі.

Напружаны старшы лейтэнант Валянцін Іваноў не крычыць на ардынарца, не адказвае на моцны, пачуты знячэўна зумер сувязі. Нічога не загадвае. Нядаўні старшына, 52-гадовы камроты моўчкі прынік да бруствера. Застыў. Стары воін ваяваў яшчэ на першай германскай, ён добра разумеў імгненні перад атакаю. Іваноў назірае за першымі дзвюма лініямі з напружанымі байцамі акурат як салдаты, лёс якіх ён ужо дзеліць паўтара года.

Высокая святая хвіліна перад атакаю, калі чалавек ні пра што не думае, не хоча думаць, і думае пра ўсё. Узгадвае самае дарагое, зробленае і нязробленае, моліцца Богу і просіць лёс. Трымае вінтоўку і глядзіць наперад, вышуквае вачыма ненавіснага ворага, якога абавязкова трэба знішчыць, толькі знішчыць. Не перамагчы – знішчыць. Яны хацелі вялікую вайну, атрымалі, займеюць большую. Мы не для таго грудзі падстаўляем пад іх кулі, каб прасіць ворагаў падняць перад намі рукі ўгору.

Салдат і афіцэр напярэдадні хвіліны літасці роўныя, малады – пажыламу, вопытны – навічку. Кожны хацеў аднаго: ацалець, не атрымаць цяжкую рану.

Высокае святое маўчанне слабых людзей, знітаваных агульнаю, адною на ўсіх небяспекаю. Адною дзеля адной – Перамогі. Маўчанне перад атакаю. Людзі ў траншэях абапал нічыйнай паласы не былі забойцамі. Перад Астралам і Космасам яны не былі вінаватыя. Забойцамі іх зрабілі іншыя. Кату руку не падаюць, бо ён забівае без рызыкі, а воіну, байцу – падавалі і будуць падаваць. Яны рызыкуюць, яны выконваюць загады, яны шурубчыкі вялікай машыны.

Выскачыў на бруствер сяржант, таксама малады, азіраўся адзінокі. Закрычаў ад страху і жадання дзейнічаць, выканаць загад. Упаў. Жвава папоўз наперад, зазыўна ўзнімаў вінтоўку.

Байцы глухія, яшчэ болей жорсткія і неміласэрныя, чым імгненне таму, засуравелыя, не людзі, а машыны; бязлітасныя робаты не чулі і не бачылі нічога. Геройства маладога камузвода і сяржанта не праняло, не парушыла даўкую цішыню (стрэлы цішыні не мяшалі). Хто-ніхто напагатоўна кратаў траншэю, не выскокваў.

– Ребята! За Ро-о-о-дину! – закрычаў раптам Глеб Марозаў, радавы, рускі, двойчы паранены, за тры гады перадавой заслужыў адзін медаль – "За абарону Адэсы". Глеб Марозаў не ўмеў ладзіць з начальствам, часцяком атрымліваў нагаНяі ад старшыны. Быў у штрафбаце. Ва ўзводзе яшчэ двое прайшлі штрафбат.

Марозаў выскачыў з траншэі і, не азіраючыся, укосікі, як з нявераны, што жывы, пабег наперад, за сяржантам. Марозаў як і не зваў за сабою, проста пабег салдацік і ўсё.

Не прашпарыў сагнуты і пяці шагоў, як хлынула чалавечая маса. Уроссып, укосікі, падаючы і ўзнімаючыся, з крыкам і без крыку. Ярасць у напружаных тварах, сцятых кулаках, гнеўных постацях.

Ад канца артпадрыхтоўкі да гэтага моманту прайшло секундаў дзевяноста.

– Усім – наперад! – крануў сувязіста на кампункце ротны; Валянцін Іваноў выскачыў да салдат, пабег заслед, паднімаў, падганяў, дзьмуў у свісток, крычаў "ура", страляў. Зазыўна махаў заградатрадаўцам.

– За Сталіна! Ура!!! – на ўсё горла рычаў палітрук роты ўкраінец Вячаслаў Малібога.

– Уррра! – гула зямля ад крыку, тупату ног, рокату танкаў.

Беглі беспартыйныя і партыйныя, маладыя і пажылыя. За Радзіму – і кожны з іх, хто ў звычайным жыцці на адзіноце, пры сваяках і нават чужых людзях, мог кпіць з яе, іранізаваць, кляў яе і ўсіх кіраўнікоў, цяпер гатовы быў выканаць абавязак, даручэнне Радзімы – разбіць ворага. Нават ахвяруючы самым высокім, адзіным, што ў яго ёсць на цяперашні момант – душою і целам, жыццём.

Беглі рускія і ўкраінцы, беларусы і літоўцы, татары і грузіны, комі і ненцы, усе, хто быў у шарэнгах, знаёмыя адзін аднаму і незнаёмыя, беглі, спатыкаліся, усхопліваліся, стралялі. Паўзлі. Тупат, грукат, стралянеча. Лавіна чалавечых целаў, згусткаў энергіі і злосці.

Ура! а! а!!

Стальная лавіна людзей, цвярозых і падвясёлелых ад ста грамаў, накочвалася на вогненныя траншэі немцаў – яны білі ў воінаў з зоркамі на пілотках і фуражках густымі кметкімі стрэламі, чэргамі. Хвілін колькі таму сціснутыя да мяжы магчымага дзве спружыны пачыналі распраствацца, савецкая і нямецкая.

Мікалай Макарэня не вырываўся наперад і не адставаў. Бег дзесьці ў другой-трэцяй лініі атакі. Страх і бесшабашнасць валодаюць яфрэйтарам, смеласць духу. Толькі наперад. Ура – і наперад! Падхоплены хваляю акрыленасці і шчасця Макарэня сігаў за першымі. Не азіраўся, ведаў, за ім яшчэ трычатыры перарывістыя лініі воінаў, дзесьці там, яшчэ далей, метраў за шэсцьдзясят, камроты. Голас і свісток старшага лейтэнанта Іванова далятаў, чуўся выразна.

Да атакі, у атацы, пасля атакі Мікалай Макарэня, як і ўсе вопытныя байцы, не лаяўся. Грэх. Брыдкаслоўе ў баі, як нож у вясковай спрэчцы, зачэпіць, параніць.

Эвенк Іван Кітаеў, мужчына гадоў пад трыццаць, прыйшоў у роту пасля ранення, бег моўчкі, траха не першы. Былы паляўнічы часта прыпадаў да зямлі, з вінтоўкі меціў цэль, зноў бег.

Большасць чырвонаармейцаў не стралялі, калі стралялі – нямеТка, прыблізна.

Немцы адбіваліся з лютасцю смелых і ўмелых абаронцаў вялікай Германіі, любімага фюрэра. Калі ярасны паток праклятых рускіх дакоціцца да іх – не ўцалець нікому.

Мікалай Макарэня бег не толькі дзеля сябе. Яго заўсёды будуць чакаць на Случчыне – маці ў Працавічах, замужняя сястра Анюта ў Вялікай Ігрушы. Бег, кіпеў усім, што і выказаць не мог, і дзеля іх. "Уцалееш, калі ў крытычную хвіліну застанешся самім сабою; дзейнічацьмеш, як салдат, – забераЖэшся". Чаго вартыя прароцкія словы бесарабскай цыганкі ў шквале металу, агаленых нерваў? Гадалка пра яго даўно забыла, а маці – ніколі. Ёй сын заўсёды трэба.

За маці – ура-а-а! За свае Працавічы – ура!

Атака; за ротаю рота першага батальёна пайшлі ў рух людзі, пад кулі.

Чым бліжэй да траншэй варожых, тым меней крыку, хутчэй бег, прыцэльней стрэлы зненавідзеных немцамі іванаў.

Мікалай Макарэня выцэльваў жывыя мішэні. Залягаў. Бег хутчэй і павольней. Былі думкі ў галаве? Была, адна, усяго адна, галоўная – ацалець, а таму паболей забіць, паболей і хутчэй. І ўсё, ні перажыванняў, ні эмоцый. Як у папярэдніх атаках – ніякага шкадобства спалоханых вачэй немцаў, раз'ятрана-злосных ці ўмольных твараў. Нават злосць не паспявала тады ўзяць Мікалая Макарэню, калі знячэўку бачыў прама перад сабою паднятыя ўверх рукі праклятых зялёнашынельнікаў – страляць нельга, не забіваюць слабых і хто здаецца. Прабягаў міма. Далейшы лёс тых, без зброі, не цікавіў яфрэйтара.

– Браткі, за радзіму – урррааа!..

Падхоплівалі мужчыны, гайдалі ў ахрыплых гартанях дарагое слова, люлялі, закалыхвалі, пакуль яно не застывала рэхам, вадгалоссямі ў разгарачанай паветранасці. Або стогнам пакуты і болю.

Мала думаў пра родныя мясціны Мікалай Макарэня да вайны. Жыў турботамі сям'і, сваякоў. Позна спазнаў, якая дарагая яму Случчына, родныя Працавічы і вёскі вакол. Прачуласць і любасць не да чалавека, а мясцовасці, хатаў і сенажацяў прыйшлі ў тлумную ваенную хвіліну; небяспека целу абудзіла душу.

Сапраўднае значэнне родных звычаяў і песняў усвядоміў Макарэня з чужых рук і вуснаў. Украінец і літовец, латыш і татарын, эвенк і таджык даражаць сваімі мясцінамі і песнямі, ганарацца, а беларус Макарэня, нібы ў яго няма роду-племені, нібы ён да вострага болю ў грудзях, да блас-[illegible]

гарэлку не было лішнім, а слова пра мову сваю было. Без кораня і лопух не бывае; чалавек не адразу будуецца, чаму ж будуем іншых, а сябе не бачым?..

У арміі, у ліхалетны час вайны і разрухі прыходзілі на перадавую на беларускай мове лістоўкі і газеты, саграваЛі сэрца, напаўнялі гонарам байца; іх выпускалі з разлікам на Макарэню і Капусту, Бялько і Самусевіча ў дывізіі і арміі, на фронце і ў далёкім тыле. Гледзячы на свядомае асэнсаванне ўкраінцам і літоўцам, рускім і татарынам радзімных месцаў, паразумнеў Мікалай Макарэня. Бацькаўшчына – маці, чужына – мачыха, зразумеў гэта, як стаў далёка ад Айчыны. Радзіма не бывае вялікай ці малой, яна адна, як маці.

– Наперад! Ураа!!

Пачуццё ачышчальнай любасці пры ўспаміне пра Случчыну пашырылася да ўсведамлення асабістай еднасці з усёю мілаю Беларуссю, яе песнямі, прымхамі, прыкметамі.

– За Радзіму, славяне!!! – выкрыквае карэл Арві Ціманен.

Уторыць беларус Мікалай Макарэня.

Сваю дзяржаву, справядлівую і несправядлівую, заўжды дарагую для іх абодвух, трэба бараніць. Варожасць да прыблудных прышэльцаў расквечвалася ўнутры поўным букетам. Чужога Мікалаю Макарэню не трэба, сваё не аддасць. Ва ўсіх войнах Еўропы ягоная Беларусь у цэнтры полымя, апрыкралі яны, вогненныя, пякельныя, час жыць спакойна. За гэта варта змагацца. Фашысты да нас прыйшлі, а не мы да іх, яны нас забіваюць і нявечаць – дык ніякай літасці. Запамятайце ўсе. Клятвапераступнікі атрымаюць пакаранне, і хутка, сабе і блізкім.

– За Радзіму, браточкі! – крычаў парторг Малібога, і беспартыйны Мікалай Макарэня сіліў заслед. Выцэльваў бліжнія і дальнія жывыя мішэні.

Махаў аўтаматам Малібога, крычаў азвярэла і лёгка, як усе.

Падала ўсё болей чырвонаармейцаў. Баляслаў Капуста, высозны, негаваркі, настаўнік, адзін з найбліжэйшых Макарэню ў роце, як і Юрка Астроўскі, няўклюдна павярнуўся спінай да нямецкіх траншэй, па-дзіцячы здзіўлена заўзіраўся на сяброў і паплечнікаў, трымаўся за грудзі. Гімнасцёрка пад пальцамі правай чырванела. Упаў Капуста, губы вышэптна паспешлівалі:

– За нашу і вашу волю. За цябе, Варшава. Я твой сын, вялікая Польшча, адрадзіся... закрасуй, як раньш... – цяжка вымольваў у неба настаўнік. – Няўжо...

Спалатнелы Капуста баяўся падумаць "канец", правільна рабіў, смерць не знайшла яго.

На бронзава-рыжым твары Капусты ззялі, кленчылі дапамогі яркія лужынкі-вочы, сталі блакітныя поўнасцю, без зрэнкаў [illegible]

Параненых не чуюць, імкліва наперад байцы, не зважаюць на крыкі Капусты "Падыдзіце да мяне!", вышэпты афіцэраў "Наперад!", не азіраюцца нават, ці ідуць следам санітары.

– Наперад! Урра! – грымяць, перакочваюцца ў полі здушнаглухія мужчынскія ўскрыкі, выі, стогны.

Дзясяткі, сотні шырока разяўленых ратоў. Зубы ды бялкі вачэй, сціснутыя рукі. Штыкі вінтовак наўскідку. Штыкі як праменні. Гэтыя прамяні пераліваюцца ў праменне салютаў. Пасля.

За тры з паловай гады вайны не раз ішоў на ворага Мікалай Макарэня. Так, грудзі на грудзі, у атацы, прамой і бескампраміснай, трэці раз. Кожны з гэтых разоў сядзіць у сэрцы, разлёгся зверам, распластаўся на векі вечныя. Так разлёгся звяруга, аж страшна памяць устрасаць. Жах у душы ад подум'я. Як і абодва раненні.

Галоўнае зараз – не адстаць. Адстанеш, будзеш болей пад кулямі, загінеш. Адстаў – ты сляпы, нічога не бачыш. Куля – дурніца, разумная дурніца, яна знойдзе цябе ці абміне, дзе б ні быў.

З Мікалаямі і Васілямі, Іванамі і Алесямі, Сяргеямі і Пятрамі крычаў, уракаў яфрэйтар Макарэня – і бег; і не было сілы, здольнай супыніць іх, прагных перамогі, адной, адной на усіх. Апроч свінцу. Воіны ведалі гэта і не палахлівілі. Небаязлівасцю [illegible]

адчайных яны былі страшныя.

Яны беглі паўз Капусту, як і дзясяткаў іншых параненых. Наперад, браткі. Сярод зялёнашынельнікаў няма герояў і патрыётаў, хутчэй іх трэба знішчыць.

– Ура-а-а! За Радзіму, ура!

Упаў, усхапіўся, ківаў наперад перабітаю рукою вясёлы дружбацкі ўкраінец Віцька Каланча, хлопчык, які ўвесь час гаварыў пра сваю вясковую дзяўчыну, не заўважаў цяпер белізны твару пасябрукоў і ўласнага, не адчуваў болю і слабасці. Глеб Марозаў ужо не крычаў, сляпымі і спакойнымі вачыма ўзіраўся ў чыстае і назаўжды яснае для яго неба. Няўмела, з цяжкасцю Зураб Жванія заціскаў сваю руку перавязкавым бінтам.

Ніхто не супыняўся. Атака! Ярасныя злыя людзі набягалі на нямецкія траншэі. Кожны мінаў сябра і прыяцеля, мёртвага ці жывога яшчэ, але ўжо не ў агульных шэрагах, наліваўся гараю лютасцю.

Наперад! За сябе і паплечніка, наперад.

Гэта былі ўжо не проста байцы. Кожны гатовы сам упасці (хоць не думаў пра гэта і марыў пра жыццё), але не супыніцца. Гладыятары выконвалі абавязак.

Хто дабяжыць, не ведалі, але імклівілі ўсё мацней... Бліжэй праклятыя траншэі, меней прыгінаюцца воіны. Рэдкі паўзе.

Паляцелі гранаты. Адзін рывок – і мы ўжо там! Памажы, вінтоўка, і будзь вернай, рука. Не падвядзі, вока. Ратуй, Божухна!

У наступе пяхота – царыца палёў, каралева бітваў. У наступе адкрытыя кожнай кулі і асколку людзі, нічым, апрача вопраткі, не прыкрытыя і ад усведамлення мажлівай параненасці яшчэ болей жахлівыя, злавесныя. Атака!

Калі на тэрыторыі вялікага Трэцяга Рэйха ішоў салдат з нашыўкаю-[illegible] Альбо памры. За любы Рэйх.

Паветра не стала. Растварылася. Раднюсенькія ўздыхі вятрыскі імпэтна разгойдвалі, люлялі людское «Гу-ы-а! Гу-а-а!». Вырычвалыя з гарлякоў жудасныя выдыхі страху, адвагі і моцы цішылі травы, самыя крэпенькія травінкі прыніцваліся долу.

Несуцешна плакала асірочваная зямля, наўзрыдма і адчайна – па найвышшых уласных стварэннях, двуногія і галавастыя за ніштО сціралі сябе з планіды, гэтасветнасці.

Не ляталі птушкі. Не каціЛі воды блізкай рэчкі. Не ўзбліскваў далёкі Балатон.

Усё скарылася здушаным і працяжным гураканнем, высардэчнай роспачнасці ўздыхаў сутаргава ўпалых, памярцвела тужлівым узмольваннем мёртвых і жывых – Богу, маці, Айчыне. Раднюсенькая цёплая зямля прымала сваіх дзяцей, абвейвала нечаканым святлом і азарэннямі, як заўжды перад сыходам у Тагасветнасць герояў, свядома аддалых жыццё за іншых.

За Перамогу.

– Урр-а!.. а.. а!..

Парадзелыя хвалі савецкіх байцоў дасягнулі нарэшце першых нямецкіх траншэй. Каму пашчасціла прабегчы, прахістацца, прапаўзці трыста з лішнім метраў нічыйнай зямлі, ужо выразна бачыў асабістых, звекавечна праклённых ворагаў. Стралялі ў гітлераўцаў на хаду, часцей прыцэльна. Кожны выбіраў мішэню імгненна, аўтаматычна, біў ворагу ў галаву і грудзі. Каб напавал, дашчэнту.

Зусім парадзелая хваля бязлітасных, азвярэлых людзей укацілася ў траншэі зялёнашынельнікаў. Літасці чакаць нельга было, праявіць літасць не было як. Або ты – або цябе. Гэта ведалі людзі над траншэямі і людзі ў траншэях.

Немцы і венгры не вытрывалі. Пабеглі. Выскоквалі, аўтаматамі з пояса, прыцэльна білі па праклятых рускіх. Кідалі гранаты. Беглі назад. Хутчэй, барджэй назад. Уцякалі.

Нясkладны, знешне слабы Іван Кітаеў у траншэі лоўка калоў штыком, біў прыкладам, не азіраўся ні на кога. Не мог азірнуцца. Мікалай Макарэня, такі ж перакошанатвары і лёгкі, бачыў людзей у траншэі і ўкрыццях, ча-ла-ве-каў – і нікога не выдзяляў, не мог выдзеліць. Кожнаму аднолькавая ўзнагарода. Для Макарэні воіны сталі розніцца колерам вопраткі, формаю каскі, відам зброі. Старшы лейтэнант Вячаслаў Малібога з фінкаю ў адной руцэ і наганам у другой; афіцэр сумленна рабіў салдацкую няўдзячна-чорную працу. Слова саступіла месца дзеянню, самае важкае, палкае і высокае слова не магло замяніць наганны стрэл, удар нажа. Палітрук Малібога памагаў сваім, спадзяваўся на дапамогу сваіх.

– Даеш Грунвальд, славяне, – шэпча Малібога і б'е аберуч. Рэжа.

З вамі Бог, а з намі хто? Вас жанчына спарадзіла, а нас хто? Вы прыйшлі да мяне ў хату і мяне хочаце забіць?! Вы, прыстойныя і добрыя, нашых дзяцей гоніце перад сабою ў атацы, затуляеце імі сябе... Гады, падлюгі!

Вы кожнаму свайму воіну хочаце паставіць асобны крыж на нашай зямлі, а мы дзясяткам, нават сотням дабрачынных хлопцаў на сваёй і чужой зямлі капаем адну брацкую магілу, ставім адну зорку. Запісаць усіх не можам. Вы паліце нашы хаты і вёскі. З людзьмі. Цяжарных і дзяцей паліце жыўцом. Грабежнікі, гвалтаўнікі. Вылюдкі. І мы вас пашкадуем?

Не падвядзі, рука. Вось так. Так будзе з кожным. З кожным.

Стралялі, білі, душылі. І выйсце было адно перад магутным і пякельным валам ярасці і лютасці воінаў савецкіх – сысці з дарогі, упасці, замерці, або з ходу ўзняць рукі.

Не сыходзілі адважныя, упэўненыя, не падалі, не ўзнімалі просьбітна рукі. З усіх відаў зброі білі немцы ў віхурны чалавечы вал. Траплялі.

Для людзей па абодва бакі траншэі не хісталіся травы, не спявалі птушкі, не дзьмулі вятры і не свяціла сонца. Не стала родных і блізкіх. Толькі таварышы па зброі і ворагі. Дзейнічалі дзе паўзком, дзе бяжком. Стралялі і рэзаліся, біліся не падлеткі, не хлопцы – здаровыя мужчыны. Мужыкі.

За сённяшні парыў страшэннай вынішчальнай узаемнай нянавісці абсалютна незнаёмых людзей астральныя сілы ўжо значылі вінаватых, неслі ім і прадкам кару.

За парадзелымі чырвонаармейцамі роты і поруч нарэшце сталі паўзці тры танкі. Металам хоць трохі патрэбна было прыкрыць агаленыя чалавечыя сэрцы.

Сумленне, шкадаванне за няўдала зробленае і зусім нязробленае не заміналі атакоўнікам. Радавыя і лейтэнанты, яфрэйтары і сяржанты былі радавымі перад смагаю аднаго – перамогі.

У траншэях, першай і другой, трэцяй, мітусіліся ўсё болей. Стралялі прыцэльна, з чаго маглі, стралялі ўсе. Гранаты ляцелі ў наступоўнікаў.

Нескарэнне ворага не ўразіла савецкіх. Вораг ёсць вораг, яго трэба знішчыць чым хутчэй, расцерці на друз. Толькі мацней перасохла ў грудзях Макарэні і Кітаева, Малібогі і Астроўскага, смялей пасігалі за танкамі, – іх на роту прыйшлося тры, адзін ужо немцы падбілі.

– Браточкі, наперад, – не загадваў, маліў палітрук Малібога.

– Санітара сюды!

Санітары нароўні з пехацінцамі ў першых радах, перавязваюць, выносяць.

– Дзякую, браце, што аддаў свой пакет, бяжы, мяне медыкі знойдуць.

На тым жа высокім парыве ўзнёслай рашучай адвагі савецкія выскоквалі з першай нямецкай траншэі, сігалі да другой, трэцяй. Адразу за немцамі. Ужо не краДком ці ўподбегі, усе ляцелі адкрыта, перамоганосна. За батальёнам батальён.

Атака, тая ж імклівая, да бязлітаснасці жорсткая, працягвалася. Або ты – або я; мяне ці цябе.

Стралянiны меней, ярасных акрываўленых людзей болей.

Падбіла другі танк, супыніўся трэці, а пехацінцы беглі, гэтак жа імпэтна, шпарка. Перад імі адпаўзалі людзі, падала ніц зброя. Пяхота заслужана даказвала сваю перавагу і моцу; безразважныя святкавалі перамогу.

Дарогу пяхоце, дарогу царыцы палёў!

І не было сярод пехацінцаў слабых і моцных. Усе асілкі, волаты, вярнідубы. Беглі і паўзлі, падалі і ўскоквалі героі. Кожны ім стаў, незалежна ад усведамлення цяперашняй уласнай дарогі, будучай адзнакі. Ацэнкі тут не было як ставіць, кожны быў варты сябе. Магло толькі заўважацца выключнае – подзвіг ці подласць. Астатняе – простая праца, гераічная, разняволеная праца.

– Наперад! – гарланіў старшы лейтэнант Валянцін Іваноў.

– Ура-а!

Не было ў шарэнгах лепшых і горшых. Усе роўныя. Як на споведзі, як перад смерцю.

Супрацiўляліся атакоўнікам забойцы. На іх ішлі забойцы. Людзі ў акопах і траншэях абапал нічыйнай палоскі зямлі гэтага не ведалі. Лічылі сябе правымі. Яны выконвалі волі вышэйшых, загады мудрэйшых.

Яны біліся за Айчыны, родных, звычаі. Хаця па вялікім рахунку былі з аднаго кораня і зямлі – славянскіх. Лаба (Эльба) і Одра (Одэр) для прашчураў атакоўнікаў былі некалі айчызнаю, як цяпер айчызна для абаронцаў. Як Бярлог (Берлін) і Ліпецк (Лейпцыг).

Два яфрэйтары, Мікалай Макарэня і Лявон Астроўскі, языкаты і смелы, якога ўжо двойчы прадстаўлялі да медалёў, беглі ўпоплечкі, амаль разам падалі і падніманіся. У азарце аднолькавасці рухаў не заўважалі часу.

Лёнька Астроўскі выручыў Макарэню – высокі паранены немец падхапіўся нечакана, аўтамат упёр сабе ў жывот. Націснуць на курок не паспеў. Макарэня зразумеў небяспеку, калі яе не стала, нават не падзякаваў Астроўскаму. Усё ўспрымалася, быццам так трэба, нібы іначай нельга. Макарэня адчуваў да Астроўскага блізоту і парадненне, як да брата. Адчайныя разам тварылі адну справу, аглушальную на ўвесь свет і на кожнага ўдзельніка, адчайную.

Бухаўшыся на зямлю, шкрабучыся ў выяміны ў пошуках прытулля ад куль і асколкаў, сябры не заўважалі мокрасці/сухасці зямлі, мух, чарвякоў. Усе помыслы пра адно – варожыя траншэі. Ура, атака. Палахлівасці, якая горш раны ў жывот, у яфрэйтараў не было.

Як і не было другой зямлі на свеце, апрача гэтай, дагледжанай акуратнай венгерскай зямлі. Я і вораг. Толькі ў тэорыі або я, або мяне, у сапраўднасці выйграю адзін я.

Мікалай Макарэня па-ранейшаму вясёлы і рэзкі, злы, воля яго рухаў нічым не скоўвалася. Былі моманты, калі працавічанцу здавалася, ён не ўзнімецца, не выберацца з ямы, не перакоціцца на другі бок калдобіны, ён абавязкова ўпадзе ад цяжару гранат, патронаў, вінтоўкі, але паказваліся людзі ў сакавіта-зялёнай ці светла-карычневай форме, у незнаёмых касках, і Мікалай Макарэня ўзнімаўся, выпаўзаў, хітраваў, дабягаў – і рабіў патрэбнае. Што тыя людзі, насупраць, хацелі зрабіць з ім. Рукі і ногі ўсё выконвалі інстынктыўна. Без думак і перажыванняў.

Бессвядомы аўтаматызм рухаў, лоўкасць і знаходлівасць радавалі Макарэню і не радавалі, ён проста не мог адчуць гэтае пачуццё, хаця ведаў – яно ёсць. Хвілінамі яму невыказна лёгка і шчасна. Усё рабілася цудоўна, нават лепш. Ён не бег, поўз, хаваўся – ляцеў. Усе рухі зліліся ў лінію палёту.

Вось ён выручыў Астроўскага і не думаў, быццам зрабіў штосьці вялікае, – каштоўнасць выратаванага жыцця ацэніцца потым. Падаў і зноў бег Мікалай Макарэня, наракаў на фізічную нямогласць, задышнасць, ні разу не мільганула, што не дабяжыць ці ўпадзе нерухомы, бяздыханны, – ні разу не думаў пра кашчавую.

Параненыя немцы паднімалі рукі, іх не чапалі, аббягалі. Адзін з немцаў, Курт Гекель, пачаў страляць у спіну атакоўнікам. Курта пакрыўдзіла, да глыбіні душы абразіла недарэчная смерць пабраціма Манфрэда.

Курт хацеў знішчыць забойцу блізкага чалавека, падбіў савецкага байца. Азірнуцца, кінуць аўтамат Курт не паспеў. У вачах атакоўнікаў забойцам быў не чырвонаармеец, забойцам стаў Курт задоўга да сённяшняй атакі, сёння ж ён, ухапіўшы зброю ў паднятыя было рукі, проста ўкараціў уласны век і век прыяцеляў-абаронцаў. Курта не паспеў забіць свой жа паплечнік Ганс; поўнасцю ўсвядоміў Ганс цану выхадкі Курта занадта позна.

За першымі шарэнгамі савецкіх войск пабеглі новыя шарэнгі, пайшлі новыя танкі. Рэзервы камандзіра палка, такія ж ярасныя і ліхія, бачылі стралянiну Курта Гекеля. Калі новая хваля савецкіх волатаў прабегла, жывых фашыстаў на ўчастку роты Валянціна Іванова ў гэтым месцы не было. Ні аднаго.

Мікалай Макарэня не памятаў, колькім чалавекам ён выратаваў жыццё, колькі чалавек выратавалі яго. Яфрэйтар аўтаматычна, з бясстрашнасцю выў і ўракаў, шчаслівым бег за іншымі. Быў першы і не першы. Хвіліна задуму перад атакаю не ўспаміналася, яна – жыццё, без яе, калі молішся Богу, лёсу, выпадку, немагчыма. Такая хвіліна прыходзіць да любога разумнага перад кожнаю вялікаю справаю.

З Мікалаем Макарэнем, ты праўду наваражыла цыганка, нічога дрэннага не будзе, ні-чога. Адно не зявай, Міколка. Не ты, дык цябе.

"Чакаюць цябе два сыны". Напляла ў Бесарабіі нежанаціку цыганка кашалі з лапцямі. Смяяліся пасябрукі з слуцкака. Які ты халасцяк! А яфрэйтар аддаў вядунцы буханку хлеба, дзве кансервы. Дарэмна, мусіць, паверыў выдумшчыцы.

Хочацца верыць чарняўцы, хочацца...

У пекле выбухаў, стрэлаў, крыкаў узводаўцаў ужо нябачна, не відаць Макарэню сваіх двух маладзёнаў.

...Позна ўвечары збярэцца ўзвод, нядаўна пераўкамплектаваны з разлікам на выбыццё байцоў. Папаўненне – дзевятнаццаць вясковых украінскіх хлопцаў. Сённяшняя атака – і з трыццаці сямі чалавек на зборны пункт узвода прыцыбалі, прыпляліся восем. У тым ліку два былыя штрафнікі. Смерць іх раней не забрала, шкадавала, злітасцівіла і сёння. Звычайна пасля зацяжной атакі, наступлення праз цэлы дзень, застаецца палова баявога складу ўзвода. Хто забіты, паранены... А тут выбыла дваццаць дзевяць! Пад Балатонам у чарговы раз немцы паказалі выдатнае ўменне ваяваць, нават у абароне.

Старшына скажа: "Хлопцы, гарэлкі ўдосталь", – і толькі двое стануць піць, узгадваць, плакаць, эхаць, выдзяквацца Богу. Рэшта, як Мікалай Макарэня, сухама ўкінуўшы чаго ў рот, зваляцца на бакавую: спаць, трызніць, плакаць, эхаць, узгадваць Бога. Вопытныя байцы, кшталту Мікалая Макарэні перад атакаю не выпівалі, пасля атакі таксама. Гарэлка цягне не ў геройства, найперш у адчайнасць рызыкі, да раны.

Стане ўзгадваць баец Макарэня сённяшнюю дзею і праз год, у Порт-Артуры – і будзе моцна стагнаць, плакаць. Як сёння ўночы. Сціскаў кулакі, скрыгатаў зубамі, божкаў, калі ўведаў, што немцы ў Беларусі спалілі шэсцьсот дзевятнаццаць вёсак, з дарослымі і дзецьмі. Два мільёны дзяцей гітлераўцы загналі ў канцэнтрацыйныя лагеры, амаль з усіх бралі кроў для сваіх параненых.

Савецкае войска ні адно нямецкае дзіця не змясціла ў канцлагер, не сцэджвала кроў з яго, а фашысты свалачніліся...

Эх, страшная балатонская атака! Паўтарыся зноў – і баец Макарэня выкіне з сэрца і душы шкадобу да любога нападніка на сваю Радзіму. Сам рване ў атаку, рэзаць, нішчыць, усіх пад корань.

...Атакі няма, атака працягвалася. Наяве ці ў сне баец падае, цалуе зямлю і выпадак, моліцца. Усхопліваецца. Ухіляецца ад кулі.

Смерці не будзе, калі ты застанешся сам сабою, ты праўду казала чарадзейка. Нашай будзе перамога.

Нічога не баяўся не адзін Мікалай Макарэня. Смерць – вызваленне, пераход у лепшы свет, і ніхто ў шарэнгах атакоўнікаў не думаў пра яе. Не меў часу. Старую з шчарбатаю касою на плячах проста адмаўлялі, яе няма. Зачараванне ярасным боем поўніла ўсіх, і хто падаў бяздыханным – пачуваўся шчаслівым, лучыўся пяшчотаю, замілаваннем. Як і кожны, хто ідзе ў лепшы свет за блізкіх, крэўства, Айчыну.

...Атака працягвалася ўвесь дзень. Чацвёртай лініі абароны ў немцаў і венграў не было. Савецкія танкі пайшлі ў прарыў. Пяхота за імі.

Яшчэ ўчора Мікалая Макарэню і паплечнікаў турбавала яда, зямлянка, вінтоўка, былі лепшыя і горшыя камандзіры – асабістае пераважвала, а ўжо сёння ўсё навокал стала добрым, людзі залатымі. Сёння на першым плане ў воінаў стаялі непераходныя паняцці – Бог, выпадак, жыццё. Сёння байцы самі сталі анёламі, вызначалі чужы лёс.


1984, 2004.



ПЕРСОНА

Алексей ЛЕЛЯВСКИЙ:

«Я хотел показать, что интеллигенция все время ноет, жалуется, ведет бесконечные пустые разговоры и ничего не делает»



Главный режиссер Белорусского государственного театра кукол – о секретах театра, фестивалях, цене наград и регалий и о детях известных людей, процветающих за границей.

«Каждый видит спектакль по-своему»

– Алексей Анатольевич, ваш театр недавно вернулся из Омска, где проходил Международный фестиваль кукольников «В гостях у «Арлекина»». И случилось непредвиденное. Гран-при «За лучший спектакль» присудили сразу двум спектаклям из Беларуси: вашему спектаклю «Почему стареют люди?..» и «Пиковой даме» Гродненского областного театра кукол (режиссер-постановщик Олег Жюгжда). Поздравляю! Выходит, уровень белорусской кукольной школы настолько высок?


– Нет, очевидно, остальные спектакли были настолько слабыми. Я посмотрел не все, но многое. Удивили только работа итальянского художника и несколько женских ролей. Все остальное было малоинтересно.

– У вас есть имя. Вы заслуженный деятель искусств Беларуси. Вы ставили по приглашению спектакли в Польше, Германии, Словении, Литве, Нидерландах. И понятно, что зовут только того, кто гарантирует успех. Ваш спектакль «Одиссей» в Санкт-Петербурге был признан одним из интереснейших театральных событий 2014 года…

– Да, «Одиссей» получил приз «Золотой софит» как лучший спектакль в кукольном театре. И вручали его одновременно с призом Алисе Бруновне Фрейндлих как создательнице лучшей роли в спектакле драматического театра. Жаль, что я не смог поехать на это вручение. И петербуржцы выдвинули «Одиссея» на «Золотую маску».

– А почему, как вы думаете, ваш «Одиссей» не получил «Золотую маску»?

– Я не сомневался, что так будет. Я очень специфически отношусь к конкурсу «Золотая маска». Но понимаю, что участие в разных конкурсах и фестивалях – необходимая часть профессии. Много раз и сам бывал в жюри разных конкурсов и заранее мог сказать, кто что получит, кто окажется на каком месте.



– Пока вы были в Омске, у меня вышла рецензия о постановках «Чайки» в трех минских театрах, в том числе и о вашем спектакле. Как вам кажется, я верно поняла ваш замысел: поднявшиеся по лестнице успеха перестают летать?

– Я давно привык к тому, что каждый видит спектакль по-своему, видит в нем нечто свое, и, полагаю, каждый имеет на это право…

Я хотел показать, что интеллигенция все время ноет, жалуется, ведет бесконечные пустые разговоры и ничего не делает. Единственный поступок за весь спектакль то, что Константин Треплев застрелился.

– Вы с успехом ставили спектакли во многих странах. Никогда не хотелось там остаться? Уехать поработать куда-нибудь?

– Мне предлагали в Словении контракт на пять лет. Я отказался. Мне хорошо и интересно работать в Минске. Я здесь родился, вырос, выучился. Мне комфортно здесь, где сходятся восточная и западная ветви славянства, здесь также ощущается и балтское течение, и европейское. Мне предлагали переехать на работу в Россию. Но у меня не лежит душа к русской сказке. Я не согласен их ставить даже за голливудский гонорар.

– Да чем же отличается русская сказка от белорусской?

– Душой они разнятся. Сюжет одинаков, а интерпретации разные.

«Однажды доеду и до Швеции»

– Сейчас уже можно вспоминать, что ваша прабабка была шведской баронессой Оглео. Вам никогда не хотелось вернуться на родину предков?

– Я побывал во многих богатых странах, в Дании, в Нидерландах. Возможно, однажды доеду и до Швеции…

– В последнее время наша интеллигенция, успешные творческие люди отправляют своих детей жить за границу. Дети знакомых журналистов, писателей, литературных критиков, актеров снимают кино в Америке, лечат людей в Канаде, преподают в Брюсселе, внуки служат в вермахте и гордятся тем, что их немецкий лучше, чем у иных арийцев. Вот и ваши сын и внук живут в Германии… А кто же будет обустраивать эту страну, если весь интеллектуальный цвет съедет за рубеж?

– У нас случай нетипичный. Мой сын окончил в Германии аспирантуру. Он там занимается исследованиями по своей теме. Кстати, группа их работает на английском и он этот язык знает лучше немецкого. У внука моего белорусский паспорт. И каждое лето у него главная мечта – добраться до нашей дачи в Острошицком городке.

– Вы как-то сказали, что очень скептически относитесь ко всякого рода регалиям, а между тем самая длинная стенка в вашем кабинете сплошь от пола до потолка увешана всякого рода грамотами и дипломами…

– Видите ли, мой кабинет и так напоминает склад. А дипломами все награждают. Поставить для них еще один шкаф, складывать в сундук? Выходит, что самое рациональное – повесить их на стену. Ценю я только диплом польского фестиваля, потому что художник сделал его вручную. Это в некотором роде произведение искусства…

– Алексей Анатольевич, ваш отец фактически был создателем профессионального театра кукол в Беларуси. Он начинал в нескольких комнатах в четвертом подъезде Оперного, и при Лелявском-старшем было построено специальное здание для кукольного театра. Он носил звание народного артиста Белоруссии, создал сначала студию, где обучали актеров-кукольников, а потом и курс в Театральном институте. Анатолий Александрович писал книги о кукольном театре и 30 лет, до 1986 года, был главным режиссером Белорусского государственного театра кукол. А главное – он сделал свой театр одним из лучших в Советском Союзе. С 1986-го и по сей день, уже тоже почти 30 лет, вы главный режиссер этого театра…

– Я с театром связан с 1979 года, когда поставил в нем свой дипломный спектакль «Соловей» по сказке Андерсена и спектакль для взрослых «Звезда и смерть Хоакина Мурьеты» по произведению П.Неруды. И еще с 1979-го по 1982 год я работал здесь завлитом.

– Стало быть, отец хотел передать вам театр из рук в руки и готовил вас к этому?

– Вовсе нет. В 1982 году я стал главным режиссером театра кукол в Могилеве. Мне нравилось там работать. Были единомышленники, творческие планы. Я не собирался перебираться в Минск. А здесь должна была стать главрежем Виктория Козлова... Но не случилось. Она заболела и не смогла. И тогда сюда перевели меня.

– Если человек вырос за кулисами кукольного театра, то ему уже суждено работать с куклами?

– Я не рос за кулисами. У меня была отличная няня, и маленьким меня брали в театр раза два-три. А свой первый кукольный спектакль я увидел в зале Института иностранных языков, потому что тогда театр был по существу разъездным и давал в год до тысячи спектаклей. В школе я увлекался физикой, математикой. Когда ломали деревянный мост через Свислочь и близлежащие дома, я собирал интереснейшие черепки, осколки кафеля и думал об археологии. И только на втором курсе института понял, что в театре кукол есть ярко выраженный знаковый ряд. А это для меня самый привлекательный вид театра. На его сцене совмещаются человек и знак. И тут бесконечное множество возможностей…


– Вы считаете себя кукловодом, кукловедом?

– Я не кукловод, это не моя специальность. Я не кукловед, потому что многие в мире знают о театре кукол больше меня. Я режиссер – и пытаюсь объяснить действительность.

Мая ГОРЕЦКАЯ.

ШАШКІ

За 64-клетачнымі столікамі



За імі праходзіла першынство краіны. У турніры мужчын наймацнейшымі былі міжнародныя гросмайстры Ігар Міхальчанка (Гомель), Андрэй Валюк (Мінск) і майстар ФМЖД Мікалай Кадзеснікаў (Бабруйск).

У жанчын жа перамаглі міжнародныя майстры Вера Хвашчынская (Бабруйск), Анастасія Барышава і кандыдат у майстры спорту Аляксандра Спірына з Мінска, якая пакарыла майстарскую норму.

Намеснік старшыні Беларускай федэрацыі шашак Віталь Варушыла перадаў па электроннай пошце фрагменты з партый. Яны ўсе цікавыя і павучальныя і заслугоўваюць увагі:

1.**Белыя** (І.Міхальчанка): a1, a3, b2, d2, e1, f2, f4, h2, h4, h6 (10). **Чорныя** (В.Навумік): a5, b6, b8, c5, d4, d6, d8, e7, f8, g7 (10). Пасля 9... d4-c3 белыя падрыхтавалі контратаку. Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Сваю кемлівасць вы зможаце праверыць у наступным выпуску рубрыкі.

2.**Белыя** (А.Валюк): b2, c1, c3, d2, d4, f2, f4 (7). **Чорныя** (В.Навумік): a3, b6, c7, d6, d8, f6, h4 (7). Выкарыстанне сілы цэнтра: 1. de3! ba5 2. de5 fd4 3. ee7 df6 4. fe5+.

3.**Белыя** (М.Кадзеснікаў): c1, d2, e1, e3, f2, g1, h4, h6 (8). **Чорныя** (А.Мечны): a7, b8, c5, d8, e5, e7, f8, h8 (8). 1... hg7? 2. dc3! gf6 3. ef2x.

4.**Белыя** (А.Плакхін): a5, b2, e1, e3, f2, f4, h2, h4 (8). **Чорныя** (А.Куніца): a7, c5, c7, d4, d6, f6, g7, h6 (8). 1. ab6 2. fg5 3. e:c7x.

5.**Белыя** (В.Хвашчынская): a1, a3, c3, c5, d2, e1, f2, h2, h4 (9). **Чорныя** (А.Стасючонак): a5, a7, d6, d8, e5, e7, f6, g5, g7 (9). 1. cd4 (c3) b4, d2 (g3) f8, a:c5x.

6.**Белыя** (Д.Федаровіч): a3, b2, d2, d4, e1, e3, f2, g3, h2 (9). **Чорныя** (Я.Якубовіч): b6, b8, c5, d8, f6, f8, g5, h4, h6 (9). Белыя з дапамогай камбінацыі ажыццяўляюць прарыў на пераддамачнае поле: 1. ab4! c:c1 2. dc3 c:f4 3. g:g7x.

Кніга пра шашкі

Самая першая кніга пра шашкі, якая дайшла да нас, выйшла ў свет у 1591 годзе. Яе аўтарам быў іспанец Педра Руіс Мантэра. Выдадзена яна была ў Валенсіі і называлася “Кніга аб гульні ў дамкі, названыя ў прастамоўі шашкамі”. Хоць спецыялісты лічаць, што была і больш старажытная кніга – кніга Антоніа дэ Тарквемада “Спосаб гульні ў шашкі, або дамкі”. Але ніводнага асобніка гэтай кнігі да нас не дайшло. Прачытаць некаторыя звесткі пра гэтыя працы можна ў “Іспанскай бібліятэцы” – энцыклапедыі Нікола Антоніа. Гэта бібліяграфічнае выданне, прысвечанае іспанскім першадрукарам. Калі верыць энцыклапедыі, кніга Тарквемады была надрукавана ў 1547 годзе.


Праверце рашэнні

“Новы раздзел” (М.Грушэўскі): **№1** – cb8!, f8 (g1) Zc5, c5x. ФМ. Zd6? (b4!, h2)=.

Мікалай ГЛАДКІ.

ТЭНІС

Азаранка вярнулася ў дваццатку...



Вікторыя Азаранка вярнулася ў лік 20 наймацнейшых тэнісістак свету.

Па выніках Уімблдонскага турніру (выхад у чвэрцьфінал) яна паднялася з 24-га на 19-е месца ў рэйтынгу ВТА.

Топ-20 беларуская тэнісістка пакінула 8 верасня мінулага года – упершыню пасля 11 мая 2008 года. Сезон-2014 яна пачынала на другім месцы, сезон-2015 – на 31-м. 2 лютага гэтага года Азаранка апусцілася на 49-ы радок, што стала горшым паказчыкам пасля 8 ліпеня 2007 года. У лік 40 наймацнейшых спартсменка вярнулася 2 сакавіка, у топ-30 – 11 мая, паведамляе БелаПАН.

СКАНДАЛ

Лолита, Сергей Лазарев и Лера Кудрявцева призвали семью Жанны Фриске не осквернять ее память



Фото: instagram.com/dmitryshepelev

Коллеги белоруса Дмитрия Шепелева по шоу-бизнесу решили поддержать 32-летнего телеведущего, посвятившего два года жизни спасению любимой женщины. Какие только обвинения в его адрес сейчас не звучат! Отец Жанны Фриске, кажется, поселился на разнообразных ток-шоу и говорит-говорит-говорит...

Больше всех происходящее сейчас в семье Фриске тронуло певицу Лолиту Милявскую.

– Я восхищаюсь Димой, в этом человеке нет ничего напоказ, и меня удивляет, что он все еще терпит вмешательство в свою жизнь, – поделилась своим мнением артистка. – Моя мама находится сейчас в Болгарии, и там же был и Дима с ребенком. Я попросила ее подойти к нему, спросить, чем мы можем помочь, и пригласить на обед. Мама сказала, что ей неудобно, потому что есть бестактные люди, которые подходили к нему с просьбой сфотографироваться, и она видела, как в этот момент он весь будто сжимался. В итоге она подошла и сказала: «Вы меня простите, я – мама Лолы, мы можем чем-нибудь помочь?» И когда он выдохнул и снял очки, она увидела его голубые глаза, полные слез. Мама до сих пор не может отойти от его вопроса: «Вы меня не осуждаете?» Она ответила: «Дима, кто может вас осуждать? Вы – замечательный отец, который ни на шаг не отходит от ребенка». В связи с этим у меня огромная просьба: все нормальные и ненормальные люди, успокойтесь и не лезьте к Дмитрию Шепелеву! Он достоин только уважения.

В поддержку коллеги и друга высказался и солист группы «Динамит» Илья Зудин. По словам друга семьи, как только Жанна узнала о страшном диагнозе, Дмитрий сразу начал искать средства на ее лечение.

– То, что Дима действительно уделял все свободное время Жанне, – это факт, – подтвердил музыкант. – Он делал то, что должен был делать любящий человек. Никто из нас не знает, как надо было делать лучше, но сейчас после драки кулаками не машут. На мой взгляд, Дима действительно приложил все возможные усилия для лечения Жанны. Не дай Бог кому-то оказаться на его месте. Дима разрывался, бегал, собирал деньги на лечение Жанны. Я считаю, что СМИ сейчас нужно объединиться для того, чтобы быть не разрушительной силой, которая ссорит людей и скандалит, а наоборот, объединить их, помирить Диму и папу Жанны. Чтобы они после смерти близкого человека не ругались, а соединились, потому что сейчас их соединительная нить – это маленький Платоша.

За мир и спокойствие в семье Фриске выступила и одна из подруг Жанны – телеведущая Лера Кудрявцева:

– Они должны разобраться сами, Бог им судья! Уверена, что они должны жить в мире и согласии, и это обязательно к ним придет. Они умные и интеллигентные люди, надеюсь. А мы, коллеги и друзья, не будем помогать раздувать этот семейный конфликт. Не нужно осквернять память такого светлого и доброго человека, которым всегда была Жанна.

Певец Сергей Лазарев, который не скрывал слез на прощании с Жанной Фриске, солидарен с Кудрявцевой. Более того, артист заметил, что дрязги и скандалы во время траура – не лучшая дань уважения певице.

– Мне кажется, что в день рождения Жанны кощунственно вообще о чем-либо или о ком-либо говорить, кроме как о самой Жанне и о упокоении ее души. Все разговоры и кривотолки, слухи и сплетни, на мой взгляд, ужасны и не должны звучать! Мы должны просто молиться за упокой ее души, – уверен певец.

КСТАТИ

Жизнь продолжается

25 июля в Константиновском дворце Санкт-Петербурга пройдет предварительная жеребьевка ЧМ-2018 – официальный старт чемпионата мира по футболу.

Провести важное мероприятие, которое будет транслироваться более чем на 100 стран, доверили Дмитрию Шепелеву и известной всему миру модели Наталье Водяновой.

ФОТАФАКТ

Да твару



Алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір разам са сваёй жонкай Наталляй сфатаграфаваўся ў вышыванцы.

Фотаздымкі з’явіліся на інтэрнэт-старонцы крамы HAY.BY. *“Алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір і ягоная жонка Наталля абралі для сябе гадзіннікі з калекцыі “Спадчына”: мадэлі з сімваламі багацця і моцы. Каханне і павага ў гэтай шчаслівай сям’і ёсць – і няхай надалей толькі мацнеюць, ды і дабрабыт не зашкодзіць”,* – гаворыцца ў паведамленні.

Фрыстайліст Антон Кушнір стаў алімпійскім чэмпіёнам у Сочы. На фінальным этапе ён змог скочыць больш прыгожа і дакладна, чым яго кітайскія канкурэнты. Цікава, што Кушнір не з’яўляецца этнічным беларусам – у сярэдзіне 1990-х гадоў ён пераехаў у Беларусь з Украіны.

ПРАГНОЗ

Негрыбны сезон



Міністэрства лясной гаспадаркі ў гэтым годзе прагназуе вельмі небагаты ўраджай грыбоў.

«Грыбоў няма. У норме яны павінны ўжо быць, а іх няма, таму што вясной вільгаці не было, летам цалкам высушвае лясную падсцілку. З грыбамі, мабыць, прыйдзецца пачакаць да наступнага года», – сказаў першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Кажучы пра ўраджай лясных ягад, прадстаўнік міністэрства канстатаваў, што яны ёсць: і чарніцы, і суніцы. *«А па журавінах пакуль складана сказаць. Узровень грунтавых вод упаў, тарфянікі і балоты сухія. З журавінамі, мабыць, будзе праблема»,* – адзначыў ён.

Разам з тым Аляксандр Кулік нагадаў, што ў цяперашні час дзейнічае забарона на наведванне лясоў амаль па ўсёй тэрыторыі краіны. Наведваць лясы можна толькі ў Валожынскім, Мядзельскім, Веткаўскім, Бераставіцкім і Мастоўскім раёнах.

Дарэчы, у 2014 годзе ў Беларусі адзначаўся небывалы ўраджай грыбоў.

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Здоровый сон длится 7 часов в сутки

Как показали исследования, оптимальная продолжительность сна для каждого человека индивидуальна.

Но если привести к общим рекомендациям, 7 часов сна лучше, чем 8. Для того чтобы полностью восстановить силы, достаточно 7 часов сна, утверждают ученые, основываясь на проведенных недавно исследованиях.

Как определить оптимальную продолжительность сна для себя? Это просто: если сна вам достаточно, вы будете бодрыми и энергичными, и будете отлично себя чувствовать. Если вы спите слишком мало или слишком много, это также скажется на вашем здоровье.

Три исследования, проведенные в разное время и с разными участниками, показали, что наибольшая продолжительность жизни у тех людей, которые спят по 7 часов в сутки. Продолжительность жизни тех, кто спит 8 часов, немного ниже. Значительно ниже этот показатель у людей, которые спят менее 6 и более 10 часов в сутки.

Однако это не означает, что вы должны спать именно 7 часов. Если у вас очень большие физические или психологические нагрузки, вам может понадобиться дополнительное время для сна.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл./факс (017) 3286871.
Тэл. рэкламнага аддзела:
(017) 3286609
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

9 772071 964000 15054

Падпісныя індэксы: 63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 14.07.2015 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 25450 экз. Заказ №2692.